ПАЛЬБА ПА ГАЛУБАХ

Яўгенія ЛЯЗО

Хай дабраславіць Гасподзь тых людзей,
якія дапамаглі выдаць кнігу

УДК 82-1
ББК 84-5
Л97

Л97 **Лязо Яўгенія**
Пальба па галубах / Яўгенія Лязо. — [б. м.] : Издательские решения, 2023. — 172 с.
ISBN 978-5-0060-3941-4

УДК 82-1
ББК 84-5

Многія кнігі распавядаюць пра вайну з пункту гледжання людзей, якія апынуліся пад нацысцкім прыгнётам. І асаблівую ўвагу прыцягваюць творы, якія апісваюць пакуты немцаў. Сярод тых, хто падпаў пад хвалю рэпрэсій, былі хрысціяне. Кнігазбор “Пальба па галубах” распавядае пра лёсы вернікаў, што ахвяравалі сабой дзеля любові Хрыста.
Хай дабраславіць Гасподзь тых людзей, якія дапамаглі выдаць кнігу.

18+ У адпаведнасці з ФЗ ад 29.12.2010 №436-ФЗ

ISBN 978-5-0060-3941-4
© Яўгенія Лязо, 2023

Прадмова

Птушкі бываюць рознымі:
Маленькімі і вялікімі,
Драпежнымі і міралюбнымі,
Пярэстымі і шэрымі.
Кожную птушку бачна па палёце,
А чалавека – па справах ягоных.
Яшчэ кажуць людзі:
Лепш сініца ў руках,
Чым жораў у небе.
Хіба маленькая птушка
Горш за вялікую?
Лепш мець гарчычнае зерне ў сэрцы,
Чым багацце праз марную справу,
Злачынную лоўлю птушак-братоў.
Пра дзікае паляванне наша песня.

КНІГА 1

ФАГЕЛІЯНА

«Лісы маюць норы,
А птушкі нябесныя — гнёзды;
А Сын Чалавечы не мае,
Дзе прыхіліць галаву»

Лукі 9:58

ПЕСНЯ 1
Арышт біскупа

Рукамі нацысцкай улады
Было скатавана ў гестапа
Страчанае Першай сусветнай
Вайной пакаленне.
Афіцэр кавалерыі Рудольф фон Фогель,
Цяперашні пастар,
Страціў лёс праз вайну.
Ён, малодшы сын графа,
Вырашае вярнуцца да хаты
Айца Нябеснага,
Таму пакідае марную славу,
Становіцца пастарам, стварае сям’ю.
Жонка Грэта памерла пры родах
Пакінуўшы Рудзі на рукі
Адзінага сына Кліма —
Хлапец у шаснаццаць гадоў
Мае сталыя розум і думкі.
Родны брат Рудольфа граф Астор
Баіцца за дзяржаўную пасаду.
Ён разам са сваім сынам Магнусам
Чыніць бяду на галаву брата Рудзі,
Бо пастар жадае верай і праўдай
Будаваць кірху без нацысцкай квашні.

***

Чыстка ў царкве пачалася
З біскупа Крыштафа Шэфэра —
Лепшага сябра Рудольфа,
І адзінага чалавека ў кірсе,
Які высока ставіць яго і шкадуе.
Пачалася трагедыя ў нядзелю,
Калі біскуп прарочыў у кірсе,
Прадстаўшы прад Богам у белых рызах
І пастарскім посахам:
«Чалавеча, паслухайся голасу
Госпада і пакайся!
Напоўніся маслам святым,
Каб не застацца за брамай
Нябеснага Ерусаліма,
Бо напісана паводле Мацвея:
„Неразумныя, узяўшы свяцільні свае,
Не ўзялі з сабою алею,
А мудрыя ўзялі алею ў пасудзінах
Разам з свяцільнямі сваімі
І калі малады замарудзіўся,
Дык задрамалі ўсе і паснулі“.
Выпраў шлях Госпаду,
Як напісана ў Ісаі:
„Кожны дол хай напоўніцца,
І кожная гара і пагорак хай панізяцца,
Крывізны выпрастуюцца,
І няроўныя дарогі зробяцца гладкімі“».
Пастар Нойман імчыцца да тэлефона.

Набірае ракавы нумар:
«Граф Астор фон Фогель?
Гэта ваш Нойман.
Паведамляю пра біскупа Шэфэра.
Гэны яўрэй блюзнерыць пра Ерусалім!»
Хутка грукнулі дзверы —
У пляме святла намалявалася постаць
Магнуса фон Фогеля.
Сын графа Астора шыбуе наперад —
Блішчаць вочы з бурштыну.
Насупраць яму — ясны погляд
Біскупа Крыштафа Шэфэра.
Старац свабодна працягвае рукі,
Шчоўкаюць бранзалеты наручнікаў.
Птушка спаймана.
«Ну што, яўрэю, дагуляўся?» —
Сціскае плячо біскупа Магнус.
Старац лагодна ўзнімае вочы
На супярэчніка:
«Калі забуду цябе, Ерусаліме,
Хай забудзе мяне правіца мая,
Хай прыліпне язык мой да паднябення,
Калі помніць цябе я не буду,
Калі не пастаўлю Ерусаліма
На чале весялосці маёй».

ПЕСНЯ 2
Пра працу пастара

Пастару Рудольфу фон Фогелю
Цяжка бывае ў кірсе,
Бо заўсёды ў царкве заняты нямала:
Да абеду наведвае вязняў у турме,
Потым вандруе па бальніцах
І дзіцячых дамах,
Увечар прымае народ у царкве.
Ходзіць фон Фогель днямі па горадзе,
Брацаючы падкоўкамі ботаў.
Ніхто не звяртае ўвагі,
Што Рудольф быў цяжка паранены
На Першай Сусветнай вайне.
Яму і царква — поле бітвы,
Дзе ён скараецца тым, хто на ім ездзіць,
Як на кавалерыйскім кані —
За медалямі. А д'ябал ходзіць,
Як рыклівы леў,
Шукаючы каго праглынуць.
Пастар Шлёсэр, цесць Рудольфа,
Любіць даваць цяжкія заданні,
Каб на Рудольфа бурчаць
За іх невыкананне.
Рудзі стаіць рукамі па швах. Слухае.
На дапамогу фон Фогелю ідзе біскуп:
«Шлёсэр, ты валадарыш над паствай!», —
Зрабіў заўвагу Шэфэр, ратуючы Рудзі.

Злы Шлёсэр пайшоў незадаволены.
Ягоная нелюбоў да Рудольфа
Пачалася даўно.
Рудзі ажаніўся з Грэтай,
Дачкой Шлёсэра. Яна раіла пераехаць
Далей ад ейных бацькоў,
Бо Шлёсэр дапякаў маладых,
Каб цяжарная Грэта пазбавілася дзіця:
Яна хворая.
Рудольф хваляваўся за яе.
Грэта адказвала:
«Не турбуйся, народзім як-небудзь!»
Так Рудзі застаўся адзін
З нованароджаным сынам Клімам.
Шлёсэр іх абодвух ненавідзеў,
Таму не дапамагаў з немаўлятам.
Тады халасты біскуп Шэфэр
Прапанаваў дапамогу з Клімам.
Часта прыходзіў да Рудольфа,
Пеставаў сына,
Каб тата мог адпачыць.

***

З прыходам нацыстаў
Жыццё ускладнілася.
Выбралі новых багоў,
Таму і вайна каля брамы.
Клім ў школе выказаўся супраць
Гітлерюгенда і ваенных замахаў краіны.
Сказаў, што бацька прайшоў вайну,

Таму мае цяжкі лёс.
Дырэктар загадаў Кліму
Запрасіць тату ў школу на размову.
Біскуп і тут не пакінуў
Спалоханага Рудольфа:
Прыйшоў разам з ім.
Белы талар Шэфэра стварылі
Няпэўнае ўражанне на дырэктара.
Справу замялі. Рудзі дзякаваў
Біскупу Крысці, і з таго часу
Яны з ім на «ты». А біскуп сказаў,
Што трэба стаяць адзін за аднаго
Да апошняга, што Божы народ
Павінны абараняцца разам,
Бо ў Нээміі напісана:
«Тады ў нізкіх мясцінах
Каля горада, за сцяною,
На мясцінах сухіх паставіў
Я народ папляменна з мечамі іхнімі,
З дзідамі іхнімі і лукамі іхнімі».
А Боскія воіны паснулі,
Як Пётр, Ян, Якаў,
Калі Юда з салдатамі ішоў за Хрыстом.
Ісус «ў змаганні ўнутраным
Руплівей маліўся,
І быў пот Ягоны, як кроплі крыві,
Што падалі на зямлю».
І пастар фон Фогель ўсё часцей адчувае
Што застаўся адзін у царкве сярод тых,

Хто выракся Бога за чарку і шкварку,
Ва імя ўласнага дабрабыту
Добраахвотна слугуючы гестапа
І дасылаючы ім ахвяр.
А Рудольф вінаваты за тое,
Што не рушыць у нагу з іхняй ідэяй.
Ідэяй, што адкінула любоў да Хрыста,
Літасць да сіраты і ўдавы.
Біскуп заўсёды быў супраць гэтага ладу.
Казаў ён старэйшаму пастару Шлёсэру:
«Ты грэбуеш братам Рудольфам!
Ён хворы за дзень абыходзіць Берлін,
Пакуль ты і Нойман сядзіце у царкве —
Па канферэнцыях ездзіце,
Дзе ў першых радах засядаеце,
І вянкі кіраўнікоў збіраеце.
Што я Богу скажу,
Калі Ён узважыць насенне,
Якое я зжаў, і скажа:
„Сапраўды, плод твой вялікі.
Толькі адно маю супраць цябе:
Чаму Лазар фон Фогель
Штодзённа сябе крыжаваў,
Калі ты па цэрквах катаўся?“
Успомні, што Клім маці не мае.
Яму бацька — адзіны сябар».
Шлёсэр узрушыўся:
«Маці не мае! А хто вінаваты?
Сам Рудзі зжыў з свету маю Грэту!»

Біскуп заступіўся за фон Фогеля:
«Чым Рудольф вінаваты ў ейнае смерці?
Грэта памерла пры родах».
Шлёсэр абураецца болей:
«Рудзі ведаў, што ёй нельга нараджаць.
Ён Грэту не адгаварыў!»
Брат Крыштаф знерухомеў,
Крыж у далонях сціснуў:
«Ты лічыш, што трэба выбраць
Забойства Кліма?..»
Шлёсэр крычыць:
«Дурню, ты гэтага не разумееш!» —
Раз'юшаны пастар хлопнуў дзвярыма,
Біскуп цяжка ўздыхнуў:
«Сапраўды, я гэтага не разумею».

***

Пасля арышту біскупа Шэфэра
Фон Фогель адчуў,
Што за спінай быццам упала сцяна.
Шлёсэр на сходзе царкоўным сказаў:
«У нас будуць Біблейскія заняткі
Ў сірочым доме. Зладзіць іх Рудзі, —
Строга глядзяць на Рудольфа
Цёмныя вочы пастара Шлёсэра: —
Ну што Рудзі, згодны?»
Фон Фогель сядзеў гладзячы пальцамі
Перабітае месца на спіне.
Ён хоча прайсціся,
Ды цярпліва адказвае:

«Я вельмі заняты ў кірсе.
І часу не маю нават на Кліма».
Шлёсэр крычыць:
«Твайму сыну шаснаццаць гадоў!»
Рудзі не хоча канфлікту:
«Добра, я згодны».
Ён ведае, што ў сірочых дамах
За кожным кутом п’янка,
Распуста і гвалт.
Дзецям патрэбны сябры,
Што падтрымаюць, паставяць на ногі,
Слёзы вытруць, прыгорнуць да грудзяў.
Ім патрэбны добры пастар —
Не Нойман і Шлёсэр.
Рудзі прымушае сябе паважаць іх,
Ды не можа. На вайне як на вайне.
А на вайне ён не паважаў камандзіраў,
Якія хаваліся за спінамі простых салдат.

***

Пасля сходу пастар Рудольф
Раскладаў па кішэнях ежу і лекі
Для вязняў у турме.
Уварваўся пастар Нойман:
«Папаўся! Я ведаў, што ты парушаеш
Закон вялікай Нямеччыны!»
Шчокі Рудольфа пачырванелі.
Шпік з пераможнай злосцю ідзе на яго
Як паляўнічы на спайманую птушку,
Ці муж, што схапіў жонку на здрадзе.

«Рудзі, чаму ты маўчыш?
Мае словы не маюць вагі для цябе?» —
Нойман спыняецца,
Баючыся падысці бліжэй.
Рудольф хавае вочы павекамі,
Гледзячы ўніз у падлогу.
Нойман чытае натацыі:
«А ты ведаеш, пастару,
Што ты саўдзельнік злачынцаў?»
Рудзі папраўляе валасы:
«Усе мы прад Богам злачынцы,
Таму Ён памёр за нас на крыжы,
Каб Крывёй выкупіць нас за грахі».
Потым Рудольф паспяшаўся да дзвераў.
У турме яго чакалі праблемы.
Фон Фогель спаведаваў вязня,
За якім ішоў палач,
І Рудольф правёў ахвяру
Па цёмным калідоры да гільяціны.
Ніводзін пастар так не робіць,
Таму служыцелі лічаць яго дзіваком.
Пасля той жахлівай хвіліны,
У якую забілі вязня,
Пастар фон Фогель многа думаў,
Успамінаючы размову з нябожчыкам.
Ён быў забойца.
З Рудольфам размаўляць адмаўляўся.
Тады фон Фогель сказаў,
Што і ён, Рудзі, забойца.

Які, верагодна, забіў больш людзей
Чым вязень. І пры гэтым ходзіць на волі.
Размова завязалася, і праз колькі хвілін
Вязень з фон Фогелем стаяў
На каленях у малітве,
Просячы Бога пра літасць.
Потым Рудольф праводзіў яго:
Каб той не баяўся.
Іншых пастараў пужае, што фон Фогель
Спакойна глядзіць на скрываўлены
Кошык з адсечанай галавой чалавека,
З якім толькі што размаўляў.
Пастар заўсёды адказвае:
«На фронце цэлае поле ўсеяна
Адарванымі галавамі, рукамі, нагамі
Ворагаў і сяброў,
З якімі толькі што размаўляў».
Сёння Рудольфу самому давялося
Ляжаць збітым турэмшчыкамі:
Адміністрацыя атрымала данос
Ад Ноймана пра ежу і лекі,
Якія носіць употай пастар фон Фогель.

ПЕСНЯ 3
Скрыпка біскупа Шэфэра

Пастар фон Фогель помніць часіны,
Калі вучыўся спяваць са скрыпачом
Біскупам Шэфэрам.
«Струн душы рука Хрыста кранаецца», —
Спяваў біскуп. Рудольф пераймаў.
Крыштаф часта бярэ яго з Клімам
У паездкі па кірхах.
У Мюнхене звычайна спыняюцца
Ў хаце пастара Кольмана.
Біскуп запрасіў ксяндза Аскара,
З якім разам служыў у вёсцы,
Бо касцёл і кірха стаялі побач.
Старыя сябры абхапіліся.
«Расстарайся мне на пастара ў кірху,
У якой ты раней служыў», —
Прасіў святар.
«Гэта Кольман», — паказвае біскуп.
«Які худы! — абдымае кволага
Кольмана ксёндз. — Кожную костачку
Памацаць можна!»
Кольман няёмка паглядае на біскупа,
І, адчуўшы ягоны спакой,
Сам пачынае давяраць ксяндзу.
«Успомні сябе, —
Шэфэр хлопае па спіне
Разгубленага Кольмана. —

Гэта зараз ты распаўнеў!»
«Я шторанак бегаю па лесе з Ёганам!» —
Жартліва абураецца ксёндз.
Ёган — святар, які прыйшоў з Аскарам.
Ён уздыхнуў, бо не любіць прабежкі.
«У мяне Рудольф хутка бегае, —
Хваліцца біскуп, —
Па бальніцах і турмах…»
«А ты на месцы сядзіш! —
Жартліва папракае Аскар, —
Памятаеш, як ты, пастару,
Да мяне на споведзь прыйшоў…»
«У спавядальні ж не бачна,
Хто прыходзіць».
«Не перажывай!
Я па галасах запомніў ўсю вёску…
Памятаю, як ты мне спаведаешся,
А я разважаю: нешта ты надумаў.
Спаведаваў цябе не падаючы выгляду.
Калі прыйшоў час ламання хлеба —
Ты на калені становішся,
А я — жартаваць, маўляў,
Мой блудны лютэранскі сын
Дахаты вярнуўся ў касцёл.
Парафія хіхікае,
А гэты сектант кажа:
„Сапраўды, але бацька блуднаму сыну
Па вяртанні даў пярсцёнак“.
Я не разгубіўся і працягнуў

Святарскі пярсцёнак
(Усё зробіш для сябра).
А гэты раскольнік схапіў пярсцёнак
І ўцякаць!
Я дагнаў, паваліў, забраў пярсцёнак,
І вярнуўся да сваіх радасных вернікаў,
Якія яшчэ некалькі гадоў
Са смехам узгадвалі нас з табой».
Клім бадзёра паглядае на біскупа:
«Чаму вы з'явіліся на імшы?»
Чырвоны Шэфэр сядзіць засмучаны:
«Аскар не ўзгадаў, што гэта
Здарылася пасля таго, як ён у кірсе
Выскачыў за кафедру».
«І што было?» — цікавіцца Клім.
Ксёндз чырванее, біскуп смяецца:
«Ну што? Крычу яму праз залу,
Каб ён правёў набажэнства,
І выходжу з царквы».
«Але я добрую казань сказаў
Тваім сектантам», — хіхікае Аскар.
«Ведаю», — Шэфэр круціць у руках
Пярсцёнак ксяндза.
Святар палахліва глянуў на свае пальцы.
«Вярні!» — крычыць Аскар.
«Вазьмі, браце езуіце, —
Крыштаф вяртае пярсцёнак, —
Чаго толькі не зробіш для сябра».
«Ты ў мяне ўжо забраў Рудольфа,

З яго б атрымаўся адданы каталік», —
Ксёндз абураецца з жартам.
«„Ён быў калісьці нягодны табе, —
Біскуп цытуе апостала Паўла, —
А цяпер годны табе і мне“.
Няхай Рудзі суцешыць маю старасць».
«Але апостал Павал
Вярнуў раба гаспадару, а ты… —
У вачах Аскара зайграла іскрынка, —
А ты знайшоў пастара,
Які падасць стакан вады!»
Біскуп смяецца:
«А ты, Аскару, хочаш ўнукаў.
Табе неабходны мілы Клім!»
«А ўнучок твой па табе пайшоў, —
Святар паказвае на Кліма. —
Разважлівы».
Раптам званяць у дзверы —
Пастар Кольман ідзе адчыняць.
Вяртаецца з багасловам Андэрам,
Які нясе рукапісы пад пахай.
Гэны багаслоў з нянавісцю
Глянуў на Аскара і Ёгана:
«Вы сябруеце з гэтымі
Ідалапаклоннікамі?» —
Пастар пераводзіць
Злы погляд на біскупа.
Крыштаф Шэфэр маўчыць.
Рудзі паднімаецца,

Цвёрда шыбуе да багаслова:
«З ідалапаклоннікамі біскуп не сябруе.
Асабліва з тымі, — былы афіцэр глянуў
На рукапісы у руках пастара, —
Якія дзеля нацыстаў
Перапісваюць Біблію».
Біскуп строга глядзіць на Андэра:
«Я не дабраслаўлю выданне
Вашай кнігі».
Андэр зло ўхмыльнуўся.
Пайшоў за дзверы.

ПЕСНЯ 4
Гняздо фон Фогеляў

Пастар Рудольф позна вярнуўся дадому.
Знімае боты з падкоўкамі,
Зазірае ў люстэрка. Праносіцца ў галаве:
«Старая кляча. На бойню ісці час».
Памяць Рудольфа малюе забытыя ўявы
Змораных хваробай,
Працай і голадам коней,
Якія да смерці цягнулі гарматы
На фронт.
Рудзі цвёрдай рукой забіваў людзей,
І не мог застрэліць знясіленую клячу.
Цягнуў вуздэчку, пхаў кашчавае плячо,
Загадваючы падымацца жывёле з зямлі.
Навошта? Чаму адкладаў
Непазбежную смерць да апошняга?
І пры гэтым калоў штыком, страляў,
Таптаў капытамі ворага. Не, не ворага,
А чалавека з іншай арміі.
Клім, які прымасціўся на ложку
Свайго бацькі, назірае за ім.
Тата кругамі віруе па калідоры,
Як тады, калі часова аслеп праз газ,
Выпушчаны на поле бітвы.
Клім ведае: пра сваю вайну думае.
Хлопец не разумее,
Чаму тата ўзгадвае гэты боль.

Рудзі праходзіць на кухню,
Каб памаліцца за паству,
Клім ціха ступае за бацькам.
Тата сядзіць на крэсле.
Чытае Біблію. Клім бачыць,
Як сінія вочы ў бурую плямку
Сліпаюцца пад акулярамі.
Клім ціхенька кліча:
«Тату!»
Вочы пастара паглядаюць на сына:
«Кліме, чаму ты не спіш?» —
Раскідае рукі фон Фогель.
Бацька і сын лучацца ў абдымках.
Клім туліцца да рудых валасоў,
Сівізной пасечаных. Пытаецца:
«Тату, што ты чытаеш?»
Тата кладзе правіцу на Пісанне:
«Выхад».
Клім сядае побач.
Пастар гартае Біблію,
Знаходзіць месца Пісання:
«„Не зважай на пустыя чуткі,
Не давай рукі тваёй бязбожніку,
Каб не быць сведкам няпраўды.
Не ідзі за большасцю на благое
І не вырашай цяжбіны,
Адступаючы з большасцю ад праўды,
І беднаму не патурай
У цяжбіне ягонай“.

Майсей заўсёды
Быў чалавекам сумленным,
Ва ўсім трымаўся Боскага шляху.
Ён пакінуў фараонскія шаты,
Бо праўду любіў, народ:
Людзей, што абвяшчаючы праведнасць,
Танулі ў грахах.
Яны палюбілі сябе больш за Хрыста,
Таму раскрыжавалі Яго.
Яны абіралі цыбулю і часнок,
Як Якаў, прадаючы свабоду.
Яны засталіся рабамі Егіпта нават тады,
Калі выйшлі з яго.
Калі я пакінуў сваю сям'ю,
Мяне чакала цяжкае жыццё.
Я рад, што ты ў мяне ёсць, Кліме,
Дагэтуль не разумею, як я наважыўся
Цябе тады душыць…»
Бацька асекся, глянуў на сына
Здзіўлены, што вымавіў гэта.
Клім сядзіць нерухома, няўпэўнены,
Што ён правільна зразумеў.
Бацька апраўдваецца:
«Я не ўмеў абыходзіцца з немаўлятамі.
Мяне ахутаў боль,
На мяне нешта найшло…
А потым я хацеў расправіцца з сабой.
І тут я спыніўся, спужаўся…
Я вінаваты перад табой!»

Рудольф плача. Агаломшаны Клім
Са слязамі прыпадае да ягонага пляча.
Рудольф песціць сына:
«Я біскупу расказаў пра гэты выпадак.
Ён не крычаў на мяне, а суцяшаў.
І ты не пакінь яго,
Калі ён будзе нямоглым.
Памятай, Крысці расціў цябе як сына».
Клім гладзіць доўгія пасмы
Рудых валасоў таты:
«Усе людзі — рабы грэху,
Які ўпадабалі больш за Хрыста».
Бацька знімае акуляры:
«Я таксама блукаў у жыцці.
Ты ж не вяртайся
На сцежку старую маю.
Помні, як я ўцякаў з Вавілона.
Быў я калісьці вясёлым хлапцом,
Як ты, прыроду любіў, з коньмі гуляў.
Мне падабалася больш не ездзіць на іх,
А чысціць, даглядаць іх здароўе,
Гутарыць з імі.
Я адвучыўся на афіцэра кавалерыі,
І раптам пачалася вайна.
Дахаты вярнуўся са спінай паламанай.
Бацька казаў, што я большы герой,
Чым старэйшы брат Астор,
З якім усё жыццё я спаборнічаў
За званне любімага сына ў бацькі.

Але што мне цяпер было да таго,
Калі жыццё паламана?
Я многа плакаў, клікаў Бога,
З Якім я не быў знаёмы.
Затое Госпад быў знаёмы са мной.
То я крычаў, што Ён вінаваты,
То ўмаляў, прасіў ацалення.
Аднойчы маці запрасіла ксяндза Аскара
Супраць бацькавай волі.
Святар мне параіў
Прысвеціць Богу жыццё.
Я вырашыў, што горш ужо не будзе.
І згадзіўся. Мы памаліліся і хутка
Жыццё пайшло на папраўку.
Я стаў хадзіць.
У адзін дзень айцец Аскар
За кубачкам гарбаты сказаў мне:
„Хлопча, ты не забыў,
Што абяцаў Госпаду?“
Тады я пачаў жыццё з новага аркуша.
Мой брат Астор вярнуўся з ардэнамі
(Хаця прасядзеў ў тыле ўсю вайну),
Таму бацька яго вадзіў па знаёмых.
Ганарыўся.
Я не хацеў быць часткай сістэмы.
Сістэмы, што трушчыць жыцці людзей
Ва імя марнай славы.
І ўцёк. Пазнаёміўся з пастарам Шэфэрам
(Тады ён служыў у вёсцы адной).

Потым Бог паставіў мяне служыцелем.
З Егіпта ўцёк я, аддаўшы вялікую цэну:
Шляхецтва, багацце і славу.
І ты, сыне мой, туды не вяртайся,
Каб не есці са свіннямі струкі».
Клім бярэ з падваконніка канверт.
«Тату, ліст ад Астора прыйшоў».
Рудзі спалохаўся:
«Гэта, напэўна, адказ на просьбу маю
Пра Крысці».
Вочы Кліма ззяюць:
«Што ты свайму брату напісаў?»
Рудольф уздыхае, выцірае пот.
Уцякае ў суседні пакой,
Вяртаецца з урыўкам паперы
З расхістанымі літарамі.
«Шаноўны Астору! Піша Рудзі.
Сёння не без твайго ведама
Быў схоплены біскуп Крыштаф Шэфэр.
Не позна пакінуць старую дарогу.
Астору, звярніся да Ісціны,
Якой аддана служыць наш біскуп,
І адпусці спакутаванага на свабоду.
Твой любасны брат,
Які штовечар моліцца за паратунак
Тваёй душы і шчыра любіць цябе».
Раз'юшаны Рудольф адкідае чарнавік.
Клім хапае ягоную руку:
«Тату, прачытай адказ!»

Рудзі распячатвае канверт:
«Дарагі Рудзі!
Чытаў я пасланне тваё.
Не думаў, што ты, апостале Паўле,
Пераадолеш свае забабоны
І схілеш калені перад уладай маёй —
Твой загадны лад гэта пацвярджае.
Малыя сабакі лаюць гучней за вялікіх,
Не маючы сілы сапраўднай.
Калі ты Хрыстовы раб,
Дык і маліся да Бога,
Чаго да Веліяра звяртаешся?
Нойман данёс, што ты цягаеш у турму
Ежу і лекі.
А Андэр — што ты разам з біскупам
Супраць новых царкоўных парадкаў.
Ты ведаеш, як ты мяне падстаўляеш
Сваімі ідэямі?!
Дык прыйду і праверу ў гэту нядзелю
Пра што ты там вучыш.
Калі нешта будзе не паводле
Дзяржаўнай прапаганды —
Чакай маёй хуткай расправы
Над сабою і Клімам.
Бывай здаровы.
Граф Астор фон Фогель».
«Кліме, што яны з намі зробяць!» —
Падае бацька на крэсла.
«Тату, не бойся, ён проста пужае.

Скажаш у нядзелю,
Што Госпад у сэрца насадзіць».
Бацька прыпадае збялелымі вуснамі
Да курчавых валасоў сына.
«Госпад цябе не аддасць
Навухаданосару ў скарбніцу!
Хутка прыйдзе другая вайна.
Не дазволю, каб ты забіваў
Людзей як я».
Клім непакоіцца,
Прыціскаецца да бацькавых грудзяў:
«Тату, давай паспяваем!»
Бацька запявае:
«Вялікі Бог!
Калі ў жыцці да рэшты
Бываю змучаны, зусім слабы,
Упаўшага Сам за руку бярэш Ты
І новых сіл даеш для барацьбы».
Клім падхоплівае:
«Тады мой дух Табе хвалу пяе:
Вялікі Бог! Вялікі Бог!»

ПЕСНЯ 5

Спевы ластавак над лугам

Луг блішчыць раскіданымі
Дыяментамі росаў.
Клім акуратна ступае,
Каб не раструшчыць
Ракушку смоўжыка.
Пастар фон Фогель ляжыць пад дрэвам
З Бібліяй у руках.
  «Тату! Глядзі, там гняздзяцца буслы!»
Бацькава постаць падымаецца з травы:
  «Дзе?»
  «На дрэве».
  «Цудоўныя! Сыне, глядзі, які смоўж».
Бацька і Клім сядаюць,
Разглядаюць вінаграднага смоўжа.
  «Якая вялікая ракушка, —
   Паказвае мезенцам тата. —
   Трэба акуратна хадзіць,
   Каб не патрушчыць».
Падымаюцца, ідуць пад руку
Па алеі таполяў. Цікаўныя птушкі
Асцярожна глядзяць на бацьку і сына.
Тата ўбірае водар квяточнага паветра:
  «Кліме, глядзі, якую прыроду
   Стварыў нам Гасподзь!»
  «А людзі яе нішчуць няшчадна:
   Лічаць сябе за паноў сусвету».

«Праўду кажаш, сыне.
А ў Бога не так ўсё.
Цары нашага веку імкнуцца
Схіляць, зніжаць, крыўдаваць.
А Хрыстос не такі:
Ён дбае пра нас Сваёй сілай.
Людзі валадараць адно над адным
Праз бяссілле.
Гасподзь, як мудры Ёў,
Не выстаўляе багацця наперад,
А лагодна пускае дажджы
Над злымі і добрымі,
Трымае нас у дужай руцэ,
Нічога не просячы акрамя любові.
І ты будзь як Хрыстос,
Які вымыў ногі Пятру.
Ісус хадзіў сярод нас,
Звычайных людзей,
Застаючыся Богам,
І добраахвотна памёр за нас на крыжы.
Сыне мой, памятай гэта,
Калі пастарам станеш —
Для гэтага Госпад даў табе мудрасць».
«Тату, я зразумеў адну рэч!
Трэба зважаць, з якім сэрцам
Бярэшся за справу.
Якая карысць ад маіх разважанняў,
Калі яны запраўлены гонарам,
А не любоўю?

Можна распавесці
Багаслоўскую пропаведзь,
Якая не кранецца сэрцаў людзей.
А можна сказаць пяць словаў з любоўю,
І ўсе будуць плакаць, бо Бог гаварыў
Тваімі вуснамі».
Ідуць далей па неабсяжнай
Райскай прасторы бацька і сын.

ПЕСНЯ 6

Забаўны спявак з прыемным голасам,
Які добра грае

Біскуп Крыштаф Шэфэр
Ляжыць у падвале гестапа.
Побач з ім — разбітая скрыпка,
На якой прымушалі граць паны з СС.
Граф Астор першым стукнуў, засмяяўся:
«Біскупе Шэфэру, зграеце псальму?»
Біскуп, падняўшы вочы, прамовіў:
«Псальма Давідава.
Над рэкамі Вавілона,
Там сядзелі і плакалі мы,
Калі згадвалі пра Сіён.
На вербах пасярод яго
Павесілі мы свае арфы.
А тыя, што нас паланілі,
Песняў ад нас патрабавалі,
А нашыя прыгнятальнікі — весялосці:
„Паспявайце нам з песняў Сіёна“.
Як нам спяваць Гасподнюю песню
На чужынскай зямлі?»
Затым біскупа пацягнулі ў падвал.
Магнус збіваў, а граф
З лісінай усмешкай пытаўся:
«Ну, прароку, скажы, хто ўдарыў цябе?»
І біскуп здзіўляўся, што Астор —
Родны брат Рудольфа, а Магнус —
Стрыечны брат рахманага Кліма,

Якога заўсёды любіў Шэфэр.
Цяпер ён ляжыць і моліцца:
«Госпадзе,
Забяры мяне да Сябе дадому».
Брат Крыштаф бачыць уяву:
Ходзіць Хрыстос гарадскімі сцежкамі.
Зіма. Нясе ў руках двух немаўлятаў.
За Ісусам ходзіць анёл, звоніць крыламі.
Піша ў сувоі.
І ніхто не пускае іх на парог.
Адчыняецца камера біскупа.
Перад сабой Шэфэр бачыць Хрыста.
Ісус цёпла ўсміхаецца,
Вочы палаюць родным агнём.
«Дабрашчасны ты, Крысці,
Бо за сваяцтва са Мной пакутуеш!»
«Ісусе, вазьмі мяне адсюль,
Я хачу на Радзіму. Знямогла душа
Ад вандравання зямнога».
«Любасны сыне,
Ты патрэбны тут, на зямлі.
Прымі дзяцей!»
«О, Госпадзе, Ты ведаеш,
Што жонкі не меў я ніколі,
Выконваючы мніскі абрад,
Які Ты мне Сам запаветаў!
І мне ўжо семдзясят чатыры!»
«Дзіцяці бярэш?»
«Вазьму, калі ёсць
Твая воля на гэта».

«Якое? Большае ці меншае?»
«Абаіх».
Біскуп схіляе галаву.
Расчыняюцца дзверы.
На парозе стаіць гестапавец Магнус
З Асторам фон Фогелем.
Граф у барсавай шубе зграбна сходзіць
Да біскупа з прыступак.
На кожным пальцы блішчаць пярсцёнкі.
Жорсткі твар з арліным носам
Глядзіць зверху на біскупа.
Хітра ўсміхаецца:
«Ну што, пане біскупе?
Пілі і елі вы тое, што даваў я?»
Граф глядзіць у кут
На некрануты кавалачак хлеба
І поўную чару вады.
Твар чарсцвее,
Сінія вочы наліваюцца гневам.
«Я кармлю вас са сваіх рук,
А вы пагарджаеце маёй прыяззю!
Ніхто так не вазіўся з яўрэем,
Як гэта раблю я!» —
Потым граф нібыта мякчэе: —
«Ну што вы скажаце
У сваё апраўданне?»
«Вы прымушаеце любіць вас
Спачатку морачы голадам,
А потым з шырокай рукі даючы хлеба.
У нас так на вёсцы сабак прыручалі

Жорсткія гаспадары».
Граф выбухае гневам, як вулкан попелам:
«Як жа вы не баіцеся мяне?
Адно маё слова —
Ваш чэрап раструшчаць!»
«Хіба мне дазволена
Баяцца забойцаў цела больш за Таго,
Хто можа душу загубіць у геене?
Вы маеце ўладу выключна
Над целам і толькі таму,
Што Гасподзь даў гэту
Ўладу па волі Сваёй.
Вы не заб'яце мяне».
Раптам гнеў графа апаў.
Ён крутануўся да біскупа
Заклаўшы рукі за спіну,
Цікаўна паглядае
Арліным профілем ў твар:
«Вам гэта Бог сказаў?»
«Так, Ён сказаў».
Граф пляснуў у далоні,
Сеў на кукішкі,
Бярэ галаву біскупа ў рукі:
«Дарагуля,
З гэтага трэба было пачынаць!
Цяпер і я бачу, што вы —
Сапраўдны прарок! —
Граф камандуе Магнусу: —
Апрані яго ў біскупскія рызы
І вязі ў наш маёнтак!»

ПЕСНЯ 7
Чаму Люціка не любяць

Біскупа Шэфэра прывезлі
Ў маёнтак графа фон Фогеля.
Гестапавец Магнус
І графскі слуга Люцыян,
Вядуць старца па калідоры
З нарцысамі на падваконніках.
З кабінета графа
Чуецца строгая размова Астора
З Канрадайн, ягонай стрыечнай сястрой
І стрыечнай сястрой Рудольфа.
Яна адвакат, які абараняе
На судах палітвязняў.
«Дарэмна вы з Рудзі прычапіліся! —
Крычыць граф на Канрадайн. —
Калі возьмешся абараняць біскупа,
Я цябе засуджу!»
«Гэта я цябе засуджу,
Калі не пакінеш Крыштафа Шэфэра!
Твае фінансавыя махінацыі
Даўно чакаюць суду!» —
Смелая Канрадайн прамаўляе цвёрда.
Астор стукнуў яе па шчацэ.
Раз'юшаны адвакат
Выходзіць на калідор. Бачыць біскупа.
«Крысці!» — радуецца кабета.
«Канрадайн, не ўмешвайся», —
Кажа біскуп. Слова біскупа — закон.

Адвакат з сумнай радасцю
Пакідае служыцеля.
Шэфэр заходзіць у кабінет графа Астора,
Дзе паабапал стаяць важкія шафы
З чырвонага дрэва,
Наўючаныя з нізу да верху
Тоўстымі кнігамі.
Біскуп ледзь паспявае чытаць карашкі:
«Астралогія», «Эзатэрыка»,
«Магія чорная», «Магія белая»,
«Скандынаўскія міфы» і іншае.
На самай высокай палічцы стаіць Біблія.
У скураным крэсле за дубовым сталом
Сядзіць граф,
Ён абапёрся шчакой аб вострую руку.
Убачыўшы біскупа, нібыта прачнуўся,
Агольвае усмешкай плацінавыя зубы:
«Біскупе, рады вас бачыць,
Сядайце на крэсла!
Калі вы прарок, скажыце,
Колькі мне жыць засталося».
«Калі не пакаецеся — памраце».
Граф хмурыцца:
«А калі пакаюся?»
«Вам трэба раздаць жабракам
Усё тое багацце, якое вы, быццам цмок,
Пад сябе загрэблі цаною
Людскіх слёз і крыві».
Вочы графа праз гнеў чарнеюць,
Слуга Люцыян выступае наперад:

«У той кнізе, што вы мне давалі,
Глыбокашаноўны графе фон Фогелю,
Было напісана, што са старцаў святых
Сыходзяць промні энергіі».
Граф прыязна ўсміхаецца хлопцу:
«І што ты мне прапаноўваеш, Люціку?»
«Вазьміце пояс біскупа
І пакладзіце на хворае месца».
Магнус наліваецца гневам:
«Тату, не вер байкам
Чараўнікоў-шарлатанаў!
Яны ў цябе столькі грошай забралі!»
Граф пярэчыць сыну:
«І лекары ўзялі грошай нямала,
А карысці ніякай».
«Мой пояс вам не дапаможа», —
Кажа біскуп.
«Люціку, узяць!» — камандуе граф.
Цэпкі хлапец здзірае пояс са старца,
На раскрытых далонях
Падносіць графу трафей.
Абодва падвязваюць пояс
Да шыі графа Астора.
Люцыян круціцца вакол гаспадара
З люстэркам, фон Фогель задаволена
Глядзіць на сябе ў адбітак.
Размотвае пояс:
«Думаю, гэтага хопіць», —
Углядаецца ў вопухаль,
Галаву адкінуўшы:

«Ах, Люціку, яна не сышла!»
Хлапечыя вочы забегалі:
«Але яна стала менш!»
«Ох, праўда», —
Аблічча графа залілося ўсмешкай.
Магнус упарціцца:
«Гэта самаўнушэнне!» —
З-пад ілба паглядае на Люціка.
Кволы хлопец уціскае галаву ў плечы,
Трымаецца бліжэй да графа.
Астор хавае слёзы далонямі:
«Што мне рабіць!»
Служка абхоплівае ягоную спіну.
Магнус тупаціць ботамі да бацькі.
Да пяшчоты не звыклы,
Зграбае яго ў абдымках,
Падаючы пад нос Люцыяна
Аграмадны кулак.
Танклявы хлапец адступае да біскупа:
«Я пакажу пану Шэфэру ягоны пакой».
У калідоры Люцыян пытаецца:
«Што вы пра нас думаеце,
Пане біскупе?»
Шэфэр на хаду завязвае пояс, адказвае:
«Вас вельмі шкада».
Люцік рэзка павярнуўся —
На яго натыкаецца біскуп
І просіць прабачэння.
Вытанчаны твар Люцыяна
Поўны неразумення.

«Чаму вы нас шкадуеце?
Мы вас білі, марылі голадам,
Прывезлі сюды супраць вашай волі…
Добра пашкадаваць графа з Магнусам.
Але мяне за што?
Я прыгожы сабой, маю грошы».
Люцыян раскінуў рукі,
Напаўабарота глядзіць на біскупа
Вялікімі карымі вачыма,
Якія жыццём бурляць.
«Люцыяне, і хаця ты кажаш:
Я багаты, разбагацеў
І ні ў чым не маю патрэбы,
А не ведаеш, што ты няшчасны
І жалю варты, і ўбогі і сляпы і голы».
Люцік распахнуў вочы:
«Гэта Бог вам сказаў?»
«Ён гэта сказаў Лаадыкійскай царкве
Трысцінкай апостала Яна.
Раю табе выкінуць усе тыя кнігі,
Што даў табе граф, і чытаць Біблію:
Гэта адзіная кніга з графскай бібліятэкі,
Вартая тваёй увагі».
Люцыян смяецца біскупу ў твар:
«Што ж вы мне, маладому
І перспектыўнаму хлопцу
Прапаноўваеце страціць маладосць
На вывучэнне яўрэйскіх легендаў?
Я лепш аслепну,
Чым вазьму Біблію ў рукі!»

«Люцыяне, папрасі даравання
Ў Госпада за свае словы».
«Не турбуйцеся, я вашу навуку знаю.
Вось ваш пакой, бывайце!»
Хлопец пастукаў
Абцасамі ўніз па лесвіцы.
Знясілены біскуп паваліўся на ложак.
Не паспеў ён заплюшчыць вочы,
Як з калідору пачуўся пранізлівы крык.
Вочы біскупа падаюць на графін —
Ён імчыцца з хрусталем
Вады па лесвіцы.
Пад акном Люцыян упаў на калені,
Учапіўся рукамі ў аблічча,
Асветленае белым промнем
Схаванага за хмарамі сонца.
Халоднае святло
Падае на спіну Магнуса.
Біскуп бачыць, як дужыя рукі
Ў медыцынскіх пальчатках
Закручваюць пробку посуду з кіслатой.
Брат Шэфэр нахіляе галаву Люцыяна,
Вымываючы кіслату з вока.
Крычыць Магнусу:
«Пане фон Фогелю, што вы зрабілі?!
Тэлефануйце ў хуткую!»
З цемры свецяцца бурштынныя вочы:
«Мой бацька вар’яцее праз жах,
А гэты і рады тлуміць яму галаву
Антынавуковымі глупствамі!»

ПЕСНЯ 8
Апошняя песня фон Фогеля

У гэту нядзелю пастар фон Фогель
Падняўся за кафедру.
Ён любасным поглядам аглядае паству.
Грукнулі дзверы.
На парозе — Астор і Магнус,
Разам рушаць да першае лавы. Сядаюць.
Нойман мілосна вітаецца
З графам і Магнусам. Саступае ім месца.
Пастар Шлёсэр махае рукамі Рудольфу
Незразумелыя знакі:
Просіць фон Фогеля не рабіць
Непрыемнасцяў. Рудольф вырашае,
Што скажа Боскае слова,
А непрыемнасці — не ягоны клопат.
«Наш Госпад —
„Вялікі арол з вялікімі крыламі,
З доўгімі пёрамі, пушысты, перысты“,
Як напісана ў Езэкііля.
Ён валадарыць небам,
І пад Ім трымціць зямля.
Людзі таксама быць хочуць багамі,
Як і птушкі малыя — арламі.
Але што чыніць чалавек,
Калі ўладу атрымлівае?
Ён пачынае валадарыць сябрамі
І прыніжаць братоў.

Гасподзь ходзіць шляхамі любові,
Таму Ён пакінуў царства арла,
І Дух Святы сышоў на Хрыста
Ў выглядзе галуба.
Госпад заклікае быць не царамі-арламі,
А лагоднымі галубамі,
Як напісана: „Будзьце мудрыя, як змеі,
І простыя, як галубы“.
А кім быць хочам? Арламі!
Мець капцюры і вострую дзюбу,
Каб есці нашых братоў –
Дробную птушку.
Не здарма на дзяржаўных сцягах
Красуюць арлы, а не галубы.
І сімвал Рымскай імперыі — арол!
У гэтай краіне нарадзіўся Хрыстос,
Каб будаваць Божае Царства
У сэрцах людзей.
„Яно — як зерне гарчычнае,
Якое, калі сеецца ў зямлю,
Ёсць найменшае з усіх зярнят на зямлі:
А як пасеяна, узыходзіць
І робіцца большае за ўсякую траву,
І пускае вялікае голле,
Так што пад ценем ягоным
Могуць хавацца птушкі нябесныя“».
Магнус схіліўся да бацькі:
«Тату, ён супраць нямецкага
Герба выступае. Будзем браць?»

«Не прылюдна», —
Астор ціха злуецца на брата.
Клім сядзіць побач і чуе размову,
Хлопец узрушана глянуў на бацьку —
Тата ўсё зразумеў.
І працягнуў прапаведаваць.

***

Пасля набажэнства Астор
Ласкава гутарыць з Нойманам,
Рудольф не марудзячы
Падхоплівае Кліма пад локаць
І выйшаў з царквы.
Краем вока Магнус убачыў куток рызаў,
Што выслізнуў з дзвераў.
Магнус крычыць:
«Тату, яны ўцякаюць!»
Абодва ідуць да здабычы.
Граф усміхаецца вернікам,
З кімсьці вітаецца.
Магнус парываецца паскорыць крок.
Абодва выходзяць за дзверы.
Астор вучыць Магнуса:
«Сыне, не трэба паніку сеяць
Сярод прыхаджанаў,
Вочы графа шукаюць: —
А вось і яны!»
Пастар азіраецца —
Занепакоены погляд Рудольфа
Сутыкаецца з вачыма Астора.

«Давай!» — адпускае граф Магнуса.
Ён ляціць як паляўнічы сапсан.
Пастар з Клімам бягуць,
Магнус іх даганяе:
Рудольф павярнуўся,
Аддзяліўшы сына ад гестапаўца.
Магнус налятае на пастара
Быццам каршак.
Мужчыны валяцца на асфальт.
Магнус уціскае пастара ў брук —
Другая птушка спаймана!
Клім здранцвеў і не можа бегчы.
Граф падбірае хлопца пад руку,
Паблажліва ўсміхаючыся:
«Ну, бароне, пайшлі».
Бацьку і сына павялі ў машыну.

ПЕСНЯ 9
Найбольшае расчараванне Магнуса

Біскуп Шэфэр грае
На заклеянай скрыпцы:
«Вялікі Бог! Калі я бачу ў свеце,
Як нішчаць праўду і святое ўсё,
А Ты іх церпіш і завеш:
„Прыйдзіце, Я дам спакой,
Я ўсім даю жыццё“, —
Тады мой дух Табе хвалу пяе:
Вялікі Бог! Вялікі Бог!»
Граф збіраўся набыць біскупу
Новую скрыпку, але музыка не ўзяў.
Прарок за ўсе дні арышту не прыняў
Ні капейкі ад графа,
З ягонага стала есць толькі гародніну
І п’е ваду і не збіраецца ўцякаць.
У пакоі з біскупам жыве
Аднавокі Люцыян,
Бо граф звольніў яго са службы.
Сябры хлопца зніклі,
А ў вёску да маці Люцыян ехаць не хоча.
Ён стараецца не трапляць на вочы графу,
Бо чуў, што той не хоча бачыць калеку
Ў сваім доме.
Таму біскуп носіць абед Люцыяну
І сам водзіць па лесвіцы,
Бо хлопец да жаху баіцца калідораў.
Цяпер ён ляжыць на ложку,

Чытаючы Евангелле,
Пакуль біскуп грае на скрыпцы.
«А граф так і не пакаяўся?» —
Пытаецца Люцыян. Брат Крыштаф
Прыціскае скрыпку да грудзяў,
Вусны кранаюцца скрыпічнай галоўкі,
Вочы задуменна глядзіць ўгору.
«Лягчэй вярблюду
Прайсці праз ігольныя вушкі,
Чым багатаму ўвайсці ў Царства Божае».
Люцыян паднімацца з ложка,
Зачапіўшы нагой біскупскі посах.
Хлопец акуратна падбірае яго,
Махае ў паветры, быццам пастух.
Біскуп забірае посах:
«Сынку, давай пакажу, як ім працаваць».
Акуратна прыціскае посах
Да пляча Люцыяна.
Хлопец заплюшчыў адзінае вока,
Уціснуўся. Біскуп гэта прыкмячае:
«Што ты, баішся?»
«Гэта палка патрэбна, каб біць авечак».
«Люцыяне, пастар ніколі не б’е авечак!»
Хлопец баязліва адводзіць посах:
«Царкоўны мабыць і не б’е.
Але авечак пастухі б’юць.
І дзяцей таксама.
Гэта я кажу як сын пастуха».
Біскуп кладзе посах. Старэчымі рукамі
Бярэ хлапечыя плечы:

«Хлопча, я, калі пасвіў авечак,
Ніколі іх не біў.
У мяне было жазло,
Якім я абараняў статак
Ад дзікіх звяроў.
А посахам я настаўляў авечак
На бяспечную дарогу,
Прыціскаючы яго да бачка,
Як я табе паказаў».
Люцыян туліцца галавой
Да грудзяў старца:
«Браце Шэфэру, вы лепшы».
Хлопчык усхліпвае.
Біскуп глядзіць у акно.
Заўважае Кліма і Рудольфа
Разам з Асторам і Магнусам. Ускрыквае:
«Фон Фогеляў арыштавалі!»

***

Граф водзіць брата па левадзе,
Шукаючы коней,
Клім і Магнус — за імі.
Астор уздыхае, убіраючы ў грудзі
Водар веснавога паветра:
«Рудзі, якая прырода, якія кветкі!
Глядзі, ад чаго ты адмовіўся
Дзеля гарадской сумятні».
Пастар не думае ні пра кветкі,
Ні пра сумятніну. Ён ахутаны думкамі,
Як будуць катаваць ягонага сына
На бацькоўскіх вачах.

«Рудзі, глядзі! Твае любімыя коні!
Магнусе, прывядзі нам Бялога».
Магнус выводзіць варанога Бялога.
Сядае на рысака без сядла.
Граф хлопае брата па спіне:
«Глядзі, які конь».
Пастар без інтарэсу глядзіць на жывёлу.
«Табе што, нецікава?
Сыне, пакажы, як ён бегае».
Магнус крануўся наперад.
Жорстка даў нагамі ў бакі каня,
Зычным голасам
Паганяючы рысака. Разагнаўся:
«Не магу яго спыніць!»
Граф спалохаўся:
«Рудзі, што рабіць?»
«Хай вядзе яго на алею.
А мы з табой перакрыем дарогу,
І конь спыніцца».
«А што, калі ён нас саб'е?»
«Не саб'е. Коні самі даволі пужлівыя».
Браты становяцца на дарогу
Раскінуўшы рукі. Конь ляціць на іх.
Тупат капыт напаўняе жахам
Трапяткое сэрца графа.
Рудзі чытае ў вачах Бялога
Няўпэўненасць — ён вось-вось спыніцца.
Граф заскочыў за спіну брата,
Конь набірае хаду, нясецца ў дзіру.
Рудольф хапае Бялога за грыву,

Жывёла робіць некалькі крокаў,
Цягнучы пастара. Спыняецца.
Рудольф паднімаецца,
Дапамагае злезці Магнусу.
У гестапаўца ногі зватнелі,
Сэрца з грудзяў ірвецца.
«Мне дапамога народнага ворага
Не патрэбна! — Глядзіць на каня: —
Што за злое стварнне!»
Пастар гладзіць шыю рысака,
Які храпай уткнуўся ў плячо Рудольфа,
Ад задавальнення заплюшчыўшы вочы
З доўгімі вейкамі. Пастар адказвае:
«Бялы зусім не злы.
Магнусе, ён спужаўся,
Бо ты моцна біў і крычаў».
«Пастар усім знойдзе апраўданне», —
Магнус глянуў на бацьку.
Граф ловіць цяжкі погляд сына,
Поўны расчаравання.
У Астора фон Фогеля некалькі
Ордэнаў за вайну,
І ён збудаваў кар’еру кавалерыста,
А тут замораны пастар
Лепш за яго апынуўся.
Клім стаіць за дрэвам —
У яго сэрца ў пяткі ўпала за тату.
Падыходзіць біскуп,
Кладзе руку на хлапечае плячо.
Клім мякка утыкаецца ў грудзі.
«Хлопча, пайшлі».

ПЕСНЯ 10
Вучні Хрыста

Люцыян супакоіўся,
Ляжыць на ложку біскупа.
Прыходзяць брат Крыштаф і Клім.
Абодва сядаюць на ложак,
Ціснучы да сцяны Люцыяна.
Той паглядае няветліва
На Кліма і Крыштафа:
«Вы, біскупе, знайшлі мне замену?»
Клім ветліва падае руку:
«Мяне зваць Клім, а цябе?»
Люцыян глядзіць у светлы твар хлопца,
Бярэ руку:
«Мяне — Люцыян, — нядобра
Глядзіць на Крыштафа. — Біскупе,
Вы хочаце зрабіць мяне
Такім жа святошам?»
Біскуп мякка паглядае:
«А чаго жа ты хочаш?»
«Я хачу піць, блудзіць
І маральна разгнойвацца!»
«Чаму не робіш таго, што сказаў?»
«Я не магу! Сябры мяне кінулі,
А аднаму грашыць — сумна.
І я цэлымі днямі сяджу з вамі не таму,
Што мне цікава Евангелле, а таму,
Што вы адзіны чалавек,
Каму я не абыякавы!»

Клім асцярожна пытаецца:
«Чым табе не дагадзіла Евангелле?»
«Святое Пісанне для такіх пабожнікаў,
Як ты!»
«Давай паглядзім на Евангелле разам.
Як ты мяркуеш, чаму адна падзея
Запісана чатыры разы?»
«Хто што запомніў, тое і запісаў».
«Я згодны з табой. Евангелле —
Сведчанні Хрыстовых сяброў!»
«Ніколі не думаў пра гэта.
Ты так проста расказваеш».
«У Ісуса таксама былі сябры:
Сымон Пётар, Андрэй, Ян і Якаў
Былі рыбакі, А мытнік Мацвей —
Супрацоўнік дзяржаўнага сектару.
Сам Хрыстос быў цясляр».
«Галантарэйшчык і кардынал —
Гэта сіла».
«А фарысеі зусім не любілі Хрыста,
Бо яны слепа выконвалі абрады
І бяздумна следавалі літары закона,
Таму ў іх сэрцах не было месца Богу».
«Мне больш за ўсіх Пілат спадабаўся».
«Чаму?»
«Ён цвяроза расцэньваў сітуацыю.
А фарысеі —
Проста рэлігійныя фанатыкі,
Якія не супраць пад’есці

З дзяржаўнага карыта рымлянаў».
Люцыян паднімаецца,
Задуменна ідзе да акна.
«Кліме, ты ведаеш, што ты яўрэй?»
«Ты так сур’ёзна сказаў,
Што я на секунду паверыў».
«Кліме, я не жартую!
Ты сапраўды па духу яўрэй.
Нешта ёсць у табе такое Хрыстовае…
А я просты язычнік, рымскі салдат,
Што працяў дзідай рэбры Хрыста.
Даруй мне, што я цябе святошам назваў.
Але гэта праўда».
Клім падыходзіць,
Туліцца плячом да пляча Люцыяна.
«Ну які я юдэй?
Юдэі — гэта біскуп Шэфэр,
Пастары Шлёсар і Нойман. Яны —
З дабрачынных хрысціянскіх сем’яў.
А я хто? Самаранін!
Мая маці — юдэйка, а бацька — рымлянін.
Мой тата — галубянё,
Узгадаванае арламі для службы кесару.
Але ўсіх нас разнастайных
Узяў пад цёплыя крылы Хрыстос,
Як галубіца птушанятаў збірае.
І паміж намі не існуе падзелу!»
Хлопцы паглыбіліся ў думкі.
Клім апамятаўся:
«А дзе брат Крыштаф?»

ПЕСНЯ 11
Допыт

Біскуп увайшоў у кабінет
Графа Астора фон Фогеля.
Ён у скураным крэсле,
Насупраць яго сядзіць Рудзі,
Побач стаіць Магнус.
Граф крычыць на Рудольфа:
«Ну што, даскакаўся, прапаведніку?
Ты ведаеш,
Што мяне пакараюць за цябе!»
«Браце, — шэпча Рудольф, —
Не чыні мне шкоды. У мяне сын малы».
Астор становіцца тварам да акна,
Заклаўшы рукі за спіну:
«Калі б не даносы на цябе
І не твае пропаведзі,
Я б цябе і пальцам не крануў!
У мяне таксама сын, і я таксама ўдавец.
І ты нас катуеш гэтак сама, як і мы вас!»
Граф адчуў, што ён трапіў
У сардэчны нерв брата.
Рудольф замер, глядзіць у спіну Астора.
Граф разварочваецца:
«Ну, пастару, і хто з нас кат і сатана?
Ты так бароніш Хрыста,
Што нішчыш Ягоны статак
Шпарчэй за ваўкоў!»
Рудзі бялее.

Астор нахіляецца да брата.
На шэрым графскім твары
Распаўзаецца зубатая усмешка.
«Астору, — ляпеча Рудольф, —
Прабач, я не хацеў зрабіць табе
І Магнусу кепска».
Граф выпрастоўваецца:
«Канешне не хацеў!
Ты сапраўдны Боскі раб,
Чыё сэрца напоўнена
Любоўю да чалавека,
І тым болей да сям'і роднага брата.
Таму мы даруем табе,
А ў знак прымірэння
Падпішы гэту паперу».
Дрыжачай рукой Рудольф бярэ аркуш.
Чытае. Падніме збянтэжаныя вочы.
«Працаваць на гестапа
І даносіць на ворагаў Рэйха? Не буду!
Мне не дазваляе Хрыстос!»
Твары Магнуса і Астора
Камянеюць праз гнеў.
«Магнусе, знайдзі Кліма,
Каб наш Абрагам прынёс Ісаака ў ахвяру
Свайму Богу!»
Магнус шыбуе праз пакой,
Адсоўвае біскупа ад дзвераў. Выходзіць.
Граф заўважае старца і ізноў мякчэе:
«Наш прарок прынёс мне слова!

Ну і што мне скажа Бог?»
Біскуп становіцца ў цэнтры пакоя.
Строгі погляд накіраваны ў вочы графа.
«Мэнэ, мэнэ, тэкэл, упарсін!
Што азначае: „Узважаны на вагах
І знойдзены лёгкім“».
Слова ўдарыла графа і ён знясілена
Апусціўся на крэсла.
Занепакоены Рудзі кінуўся да брата,
Крыштаф схапіў яго за руку:
«Рудзі, не трэба!»
«Крысці, ты жывы!»
Рудзі паваліўся на шыю старца.
Крыштаф кажа:
«Я марыў аддаць жыццё за Хрыста,
Але ў Госпада на мяне іншыя планы.
А ты аддасі сваю душу за Бога?»
Пастар палохаецца:
«Я не магу — у мяне сын!»
«Ці ж не дзве маленькія птушкі
Прадаюцца за асарый?
І ніводная з іх не ўпадзе на зямлю
Без волі Айца вашага.
Загінеш за Бога?»
Пастар уздыхае:
«Так».
Твар біскупа свеціцца.
«Я пакідаю цябе.
З Богам, браце Рудольфе!»

Магнсус прыводзіць Кліма.
Старац усмешкай падбадзёрвае
Спалоханага хлопца. Сыходзіць.
Гестапавец кідае Кліма на падлогу.
Абцас графа навісае
Над скроней падлетка.
«Ну што, тата, ці аддаеш
На раскрыжаванне дзіця?»
Пастар абапіраецца на спінку крэсла.
Ён глядзіць у спалоханыя вочы сына.
Бацькавы голас дрыжыць:
«Сыне, даруй мне, хутка мы будзем
Са Хрыстом на нябёсах! Разам!»
Тата апусціў галаву на спінку крэсла
І ціха, вельмі ціха, каб ніхто не пачуў,
Заплакаў.
Граф адводзіць абцас ад галавы Кліма,
Садзіць хлопца ў скуранае крэсла.
Адкрывае віно, абапіраецца спінай
Аб дубовы стол,
Закінуўшы нагу на нагу.
«Магнусе, вядзі Рудольфа ў падвал
І дапытвайся пра што хочаш».
«Гэты ўсё роўна нічога не скажа,
Колькі яго не катуй.
Дай мне і Кліма, каб з яго ўсе жылы
На вачах у бацькі павыцягваць.
Тады пастар расколецца».
Граф адмахнуўся рукой. П’е з чаркі:

«Не, катэгарычна не.
У мяне на яго свае планы».
«Што значыць „свае планы“?
Ты будзеш пакрываць Кліма?
Гэта сын ворага Рэйха!»
Граф знясілена пераводзіць
Погляд на сына:
«Магнусе, ты што?
Па радыё дзяржаўнай
Прапаганды наслухаўся?
Які Рэйх? Мы тут грошы робім!»
Магнуса быццам маланкай стукнула.
Ён марудна паварочваецца да бацькі:
«То бок, як?.. А Нямеччына?
А чысціня арыйскай крыві? А фюрэр?»
«Хлопча, гэтыя казкі фюрэру
Й будзеш расказваць.
Дай мне пажыць для сябе».
Магнус вядзе пастара ў падвал.
Збіццё не прыносіць яму
Ніякага задавальнення,
І пытанні ён задае скрозь туман
Свайго розуму, занятага праблемай
Больш важнай, чым пастар.

ПЕСНЯ 12
Спакуса

Клім нямогла ляжыць на крэсле,
Адкінуўшы галаву як лялька.
Граф пляснуў віно ў чарку,
Паднёс да хлапца.
Вусны Кліма нерухомыя,
Край чаркі запацеў.
«Кліме, няўжо ты сапраўды падумаў,
Што я заб'ю цябе?
Я ж люблю свайго пляменніка!» —
Граф усміхаецца зубамі з плаціны.
Вочы Кліма апускаюцца на дзядзьку.
«Вы – ліса, — ледзь дыхае Клім, —
Сапраўдная ліса!»
Граф нервова пасьмейваецца,
Трымаючы чарку за край.
«Такая ж ліса, як і Пілат?»
«Пілат выконваў законы сваёй краіны.
Вы — Ірад. Ірад, што адсек
Галаву Яну Хрысціцелю
І здзекаваўся з Хрыста,
Патрабуючы цудаў!»
«Не пужай мяне гучнымі словамі,
Як робіць ваш біскуп, —
Граф павярнуўся да акна,
Заклаўшы рукі за спіну. —
Ты, я бачу, любіш чытаць Пісанне.

Я таксама люблю», —
Граф паказвае на Біблію ў шафе.
«Любіце чытаць Свяшчэннае Пісанне?
А чаму яно на самай высокай палічцы?»
«Бліжэй да неба».
«Біблія павінна стаяць не бліжэй да неба,
А бліжэй да сэрца».
Граф павярнуўся,
Вочы цікаўна ззяюць.
«Мэнэ, мэнэ, тэкэл, упарсін,
Што азначае: „З намі Бог“!
Я бачу, што ты мудры.
Не здарма на цябе
І твайго бацьку напісалі данос,
Калі ты ў школе выказаўся
Супраць Гітлерюгенда.
Канешне табе нельга туды ўступаць —
Там уразаюць мазгі!
Бачыш, што з маім Магнусам зрабілі?
І не крыўдуйся на настаўнікаў,
Што ставяць корку хлеба
Вышэй за мараль.
Галоўнае, што ты не такі!»
Клім прыклейвае вушы.
«Папалася птушачка, —
Думае граф і працягвае: —
Канешне ты не такі!
Ты ўвесь у свайго бацьку!
Ён ніколі не гандляваў ідэаламі

Як Нойман і Андэр.
Праўда, дзеля Хрыста ён заўсёды
Расплачваўся табой
І ты рос поўным сіратой
Пры жывым бацьку —
Так мне паведаміў Нойман.
Тата быў гатовы аддаць тваё жыццё
Дзеля вялікай ідэі».
Погляд Кліма дранцвее.
Граф падкаціўся да яго,
Абдымае кволыя плечы:
«Сумна, Калі блізкія здраджваюць нам
Дзеля ўласных інтарэсаў.
Але страчваючы адно,
Мы набываем больш, чым мелі.
Так бывае не заўсёды,
Але я паклапачуся,
Каб гэта адбылося з табой».
З вачэй Кліма сачацца слёзы.
«Кліме, я паклапачуся пра цябе.
Ты будзеш паважаным баронам,
А не Хрыстовым рабом, як твой бацька».
Погляд Кліма цвярдзее —
Тонкія рукі б’юць па стале:
«Вось куды вы хіліце!
Я ледзь не прадаўся
Вам за зацірку з сачавіцы!»
Уваходзіць біскуп:
«Магнус павесіўся».

ПЕСНЯ 13
Чайная размова

Біскуп і граф сядзяць у альтанцы
За кубачкам гарбаты. Граф плача:
«Біскупе, не магу паверыць,
Што гэта здарылася з маім сынам!»
Біскуп падлівае гарбату ў кубак графа.
«Мы любім уяўляць сябе
Валадарамі жыццяў,
А самі не можам павялічыць свой рост
Нават на локаць, і нават падлічыць
Валасы на ўласнай галаве».
«Я хацеў бы з вамі паспрачацца, біскупе,
Ды не маю аргументаў!
Пайграйце мне на сваёй скрыпачцы:
Яна мяне вельмі суцяшае!»
«У іншы раз».
Граф падымаецца і шыбуе да Кліма
З Люцыянам, якія сядзяць на лаве.
Клім плача. Люцыян суцяшае:
«І правільна зрабіў,
Што не паслухаў графа! —
Паказвае на параненае вока: —
Я таксама яму калісьці давяраў,
Цяпер глянь, што са мной!»
«Не мая правіна,
Што ты без вока застаўся», —
Знянацку кажа граф.

Люцыян адскочыў
І Астор заняў ягонае месца.
«Графе, — абараняецца Клім, —
Я не застануся з вамі
Нават калі памрэ мой бацька».
«Няўжо ты не хочаш
Заняць месца Магнуса?»
Падыходзіць біскуп са скрыпкай:
«Графе фон Фогелю,
Вы хацелі паслухаць музыку.
Я спяю вам прытчу».
Граф з усмешкай
Паварочваецца да музыкі.
Брат Крыштаф ударыў
Смыком па струне.
«Два чалавекі жылі ў адным горадзе:
Багаты і бедны.
Багаты меў статкі буйныя,
А бедны не меў анічога,
Апроч ягняці малога,
Якое ела ягоны хлеб і піла
З ягонай чашы, спала на грудзях яго
І было як дзіця.
Прыйшоў да багатага падарожнік,
І багаты пашкадаваў авечкі адной
Са статку свайго.
І узяў ягняці ў беднага
І прыгатаваў дарожніку».
Біскуп разануў смыкам струну.

Граф ускрыкнуў:
«Я вас заб’ю!» — і кінуўся прэч.
Брат Шэфэр глядзіць ў след:
«Канешне, пасля чараўніцтва
Чалавек апантаны нячыстым».
Клім яшчэ плача:
«Што з маім бацькам?»
Біскуп абдымае хлопчыка.
Мякка заглядае ў ягоны твар:
«Аддай усё ў Божыя рукі.
Кліме, колькі маленькіх птушак
Прадаюцца за асарый?»
«Дзве», — выцірае слёзы Клім.
«І ніводная з іх не ўпадзе на зямлю
Без волі Айца вашага.
Люценька, пасядзі з Клімам,
А я пайду паклапачуся
Пра брата Рудольфа».

ПЕСНЯ 14
У Сіёнскай святліцы прыбранай

Біскуп адтуляе люк,
Пусціўшы прамень святла ў падвал.
Спускаецца па лесвіцы,
Трымаючы захутаныя ў тканіну
Хлеб, віно, келіх.
Святло падае на куточак
Чорнай тканіны.
Біскуп угледжвае постаць у талары:
«Браце Рудольфе?»
Постаць уздыхнула,
І сэрца старца ўзрадавалася.
Брат Шэфэр сядае,
Пераварочвае Рудольфа на спіну:
«Не бойся. Крысці вячэру прынёс».
Павекі пастара расплюшчваюцца,
Сінія вочы ў бурую плямку
Бачаць у белым святле белыя рызы.
На вуснах Рудольфа заззяла ўсмешка:
«Хрысце!»
«Гасподзь Ісус у тую ноч,
У якую прададзены быў,
Узяў хлеб і, падзякаваўшы,
Разламаў і сказаў:
„Прыміце, ежце, гэта ёсць Цела Маё,
За вас ламанае, Гэта рабіце
Ў памяць пра Мяне“.

Гэтак сама і чару
Пасля вячэры, і сказаў:
„Гэтая чара ёсць новы запавет
У Маёй Крыві, гэта рабіце,
Калі толькі будзеце піць,
У памяць пра Мяне“».
Рудзі прыняў святыні
І ўсмешка навечна заззяла
На ягоным абліччы.

ПЕСНЯ 15
Новы мір

Брат Крыштаф, Клім, Люцыян
Едуць на цягніку ў вёску біскупа.
Шэфэр уяўляе, як перадасць
Хлопцаў на выхаванне
Пастару Кольману, які пераехаў
Служыць у новай кірсе.
Граф Астор адмовіўся
Ад апекі над Клімам і хутка памёр,
А Канрадайн дазволіла хлопцу застацца
Ў біскупа.
Надвор’е светлае:
Неба блакітнае, трава мяккая,
Цёплая пад сонечным промнем.
Клім сядзіць поплеч з Люцыянам.
Хлопцы толькі цяпер адышлі ад страты,
Страты, што стала набыццём
Для Жыцця Вечнага.

КНІГА 2

ПАСТАРАЛЬ

«Царства Божае...
Як зерне гарчычнае,
Якое... пускае вялікае голле,
Так што пад ценем ягоным
Могуць хавацца птушкі нябесныя»

Марка 4:30-32

ПЕСНЯ 1
Пастар Кольман

Айцец Аскар падчас
Імшы узнімае баранак у неба:
«Гасподзь Ісус узяў хлеб і,
Падзякаваўшы, разламаў і сказаў:
„Прыміце, ежце, гэта ёсць Цела Маё,
За вас ламанае, гэта рабіце
Ў памяць пра Мяне“».
Айцец Ёган Бех назірае
Праз тоўстае шкло акуляраў
За старэйшым сябрам.
Ён разам з Аскарам
Служыць набажэнствы ў касцёле
Дваццаць гадоў, і Ёган кожны дзень
Вучыцца новаму ў старога ксяндза.
Ніводны рух Аскара не хаваецца
Ад чорных вачэй.
Ёган глядзіць, як старэчая рука
Падае хлеб вернікам,
Як Аскар з лагоднай любоўю
Схіляецца перад абразом Панны Марыі.
Ёган прыкмячае, што фарба
Старое выявы патрэскалася,
І бачыць, як Аскар становіцца
Перад алтарам і гучна запявае:
«Гасподняя зямля і ўсё,
Што на ёй, сусвет і ягоныя жыхары,

Бо Ён заснаваў яе на морах,
І на рэках яе ўгрунтаваў.
Хто падымецца на гару Гасподнюю,
Альбо хто стане
На святым месцы Ягоным?
Той, у каго рукі невінаватыя
І чыстае сэрца, не прысягаў хто
Душою сваёю напуста
І не бажыўся хлуслівa...»
Пасля імшы вернікі разышліся.
Святары засталіся адны.
«Што цябе турбавала, Ёгане?»
«Войча Аскару, паглядзіце на абраз
Найсвяцейшай Панны Марыі».
«Ёгане, мы дамаўляліся,
Што мы не свецкія паны,
Якія ужываюць тытулы
І звяртаюцца на „вы“,
А браты аднаго бацькі — Ісуса Хрыста.
Да Бога ты на „вы“ не звяртаешся,
А я не вышэйшы за Госпада».
Абодва глядзяць на абраз.
«Сапраўды, — згаджаецца Аскар, —
Абраз трэба аднавіць».
«Але ў нас нават няма фарбы!»
«Сыне, ты сёння на імшы чытаў,
Як Госпад накарміў
Пяццю хлябамі і дзвюма рыбкамі
Пяць тысяч, не лічачы жанчын і дзяцей.

Ты верыш Пісанню?»
«Веру».
«Калі Хрыстос мае ўладу
Рабіць такія цуды,
Хіба Ён не можа даслаць
Баначку фарбы сваім рабам?
Схадзі ў кірху і папрасі фарбы.
А я прынясу ляскі».
Ёган узрушыўся:
«А можна я схаджу за ляскамі
Я малады — лепш мне цяжар цягаць».
«Хлопча, не бойся.
Схадзі ў кірху і ты ўбачыш,
Які цуд зробіць Гасподзь».
Ёган ідзе ў лютэранскую кірху,
Пабудаваную побач з касцёлам.
Ксёндз недаверліва ўглядаецца
Ў белыя сцены.
Кірху пабудавалі нядаўна
І хутка яе адчыняць.
Ёган стаіць на парозе,
Нерашуча бярэцца за ручку,
Палахліва ўзнімае галаву да неба:
«Найсвяцейшая Панна Марыя,
Абарані Свайго сына!»
«Вы моліцеся перад нашай кірхай?» —
Гучыць высокі голас.
Ёган падскоквае і, узрушаны,
Прыпадае спінай да дзвераў.

Перад ім стаіць пастар Кольман
Са светлымі вачыма,
Што палаюць блакітным агнём,
Твар асветлены шырокай ўсмешкай.
Пастар працягвае руку.
Ксёндз нерашуча вітаецца.
Кольман адкрывае ключамі дзверы,
Заходзіць унутр, Ёган — за ім.
«Па якой вы да нас справе, войча?» —
Пытаецца Кольман.
Ёган уздыхае:
«Нам патрэбна фарба,
Каб падправіць абраз».
Вочы Кольмана ззяюць ярчэй:
«Я дапамагу, у нас якраз ёсць фарба
І я маю вопыт малявання выяваў».
Айцец Аскар сядзіць у касцёле
І, схіліўшы галаву, моліцца.
Кольман рушыць наперад
З банкамі фарбы. За ім крочыць Ёган.
Кольман вітаецца з айцом Аскарам,
Ксёндз радуецца:
«Мір табе! Дзякуй Богу за брата,
Які дапаможа нам!»
Кольман адкрывае банкі з фарбай,
Асцярожна наносіць мазкі на абраз.
Ёган Бех толькі цяпер заўважае,
Які худы Кольман,
Але шчырая ўсмешка

Хавае хворасць пастара.
Радасны Аскар распытвае Кольмана
Пра здароўе падапечных ягонага сябра
Біскупа Крыштафа Шэфэра:
Кліма і Люцыяна. Потым Аскар і Ёган
Спускаюцца на кухню.
Ёган удумліва кладзе цукар у кубачак.
Задаволены Аскар кажа:
«Кольмана трэба пачаставаць.
Недзе была шакаладка».
«Трэба, толькі не шакаладкай.
Мяркую, ён хворы на страўнік».
«Тады мы яблыкаў яму дадзім.
Вазьмі ў шафе таз», —
Аскар паказвае на дзверцы шафы.
Абодва рушаць па лесвіцы.

***

За касцёлам расце разгалістая яблыня.
«Як дастаць яблыкі? — пытаецца Ёган. —
Ляскі ў Кольмана. І не натрасеш —
Вунь які ствол!»
«А ты залезь», — Аскар не думаў,
Што Ёган баіцца вышыні,
А Бех яму не прызнаўся.
Таму Аскар пакінуў разгубленага сябра
Аднаго пад дрэвам.
Добра, што прыйшоў Кольман з ляскамі.
Ёган ставіць лесвіцу пад дрэва,
Нясмела паднімаецца на ўсходзец,

Учапіўшыся ў ляскі.
Ксёндз спалохана паглядае ўніз,
Але пастар падхоплівае яго пад локаць.
«Не бойцеся. Толькі ўніз не глядзіце!»
Ёган пераступае вышэй.
Цяпер Кольман трымае толькі
Крысо ягонае сутаны.
Ксёндз цягне дрыжачую руку
Да чырвонага яблыка. Зрывае.
Хутка таз напаўняецца, і Кольману
Цяжка яго трымаць. Таму пастар
Ставіць посуд на зямлю,
Беручы яблыкі ў Ёгана
І перакладаючы ў таз.
Але ксёндз бачыць,
Што і гэта пастару цяжка.
Кольман трымае боль у сабе.
Калі нахіляецца, не дае светламу твару
Выдаць рэзь у жывоце.
«Пастару, давайма памяняемся», —
Прапаноўвае Ёган.
Кольман без ляскоў заскочыў на дрэва.
Аглядае галіны:
«Усе збіраць?»
«Самыя лепшыя».
Пастар забывае пра страўнік —
Пільныя блакітныя вочы
Шукаюць сакавітыя яблыкі,
А тонкія рукі хутка зрываюць.

ПЕСНЯ 2
Гісторыя пастара Кольмана

«Як вы не баіцеся ўпасці?» —
Пытаецца Ёган.
«Я да дрэваў прывык,
Бо я — арнітолаг і лячыў птушак».
«А цяпер?»
«Мяне засудзілі за гэта».
«Што вы зрабілі?» — спалохаўся айцец.
«Я парушыў дагавор
З гаспадаром аднаго какаду.
Ягоны папуг зламаў крыло так,
Што ён і пасля аперацыі
Не змог бы лятаць.
Я сказаў гаспадару,
Што мне прыйдзецца абрэзаць крыло.
Тады гэты чалавек прапанаваў
Усыпіць яго і даў грошы на гэта.
Тады я падпісаў дагавор,
Але не ўсыпіў папуга,
А вылячыў яго на гэтыя грошы.
З паловай крыла какаду лятаць не мог,
Але я палюбіў яго і такім.
Потым аддаў знаёмай дзяўчыне,
Якая сябравала з дачкой таго гаспадара.
Дачка спазнала птушку,
І гаспадар падаў на мяне ў суд,
Што быццам я прадаў ягонага какаду

(Хаця я аддаў птушку бясплатна)
І скраў грошы,
Якія ён мне даў за ўсыпленне.
На судзе мяне абараняла Канрадайн —
Мой даўні таварыш з кірхі.
Мяне не пасадзілі, але забаранілі
Працаваць ветэрынарам.
Я люблю жывёл
(Ведаю, глупа гучыць)
І цяпер дапамагаю
Дзікім параненым птушкам».
«За свой кошт?»
«А за чый жа?»
«Гэта трэба траціць столькі сіл
І грошай на птушак,
Якія жывуць пару гадоў!»
«Госпад за нас таксама аддаў
Вялікую цэну! І я хачу хаця б крыху
Быць падобным да Хрыста».
«Кольмане, добра,
Што ты любіш прыроду.
Гэта не глупа».
«Я ведаю, што гэта добра,
Але з мяне пастары смяюцца,
Што я замест таго, каб быць
Паспяховым сем'янінам,
Пешчу птушак!»
Ёган убачыў слязу на шчацэ.
«А што мне рабіць? — плача пастар. —

Дзяўчыны адмаўляліся
Выходзіць за мане,
Калі я папярэджваў,
Што ў мяне не будзе дзяцей
Праз хваробу.
Нават Канрадайн аддала перавагу
Майму старэйшаму брату.
Я не вінюя яе:
Я б сам адмовіў сабе на ейным месцы.
А тут яшчэ мой рак страўніка…» —
Пастар дрыжыць праз слёзы.
«Кольмане, я таксама без сям'і,
І мне таксама бывае адзінока,
Але я люблю чытаць».
Пастар уздыхае:
«Мо і мне паспрабаваць?» —
Кольман спускаецца з дрэва.
Ёган падае таз, поўны яркіх,
Спелых яблыкаў:
«Гэта табе», — айцец выпадкова
Звяртаецца на «ты».
«Я збіраў найлепшыя яблыкі для вас,
Мне няёмка іх забіраць! —
Пратэстуе Кольман і здаецца: —
Дзякуй вам», —
Пастар падбірае посуд і ідзе дахаты.

ПЕСНЯ 3
Шлях да Хрыста

Ёган нарадзіўся ў звычайнай
Каталіцкай сям’і.
Цэлыя дні ён чытаў хрысціянскія кнігі,
Пакуль астатнія хлопцы
Ганялі мяч на двары.
Бацькі ўміляліся дзіцем,
Якое не водзіцца з дурнымі гуртамі,
І заўсёды дома пад наглядам.
Сапраўды, Ёган не разумеў
Сваіх школьных таварышаў,
Бо ім падабалася біцца,
Крыўдзіць адзін аднаго,
Цягаць дзяўчынак за косы.
Не разумеў і бацькоў:
Чаму яны радуюцца таму,
Што ён адзінокі і не мае сяброў?
Толькі аднойчы ён сапраўды сябраваў.
У чатырнаццаць гадоў пазнаёміўся
З хлопцам у касцёле.
Той быў адзіным чалавекам,
Які не стамляў Ёгана прысутнасцю,
І Бех сам шукаў з ім сустрэчы.
Так прайшоў год,
А потым сябра пераехаў.
Сувязь згубілася.
Ёган ізноў утануў у кнігах і не заўважыў,
Як з кволага падлетка

Вырас у статнага хлопца.
Бех не мог не заўважыць,
Цікаўныя погляды дзяўчат
І шэпат за спінай,
А хлопцы з павагай сталі вітацца,
Ціснучы руку.
Бацькі таксама захаплялiся сынам
І прыглядалі, з кім яго ажаніць.
Аднойчы Ёган аб’явіў,
Што хоча стаць ксяндзом.
Маці плакала, а бацька задумаўся.
Ёган здзівіўся: чаму яны,
Шчырыя вернікі, не радуюцца?
Іхні сын будзе слугою Хрыста!
Калі бацькі аплакалі сына,
Ёган пайшоў вучыцца на ксяндза,
Чакаючы сустрэць
Сапраўдных хрысціянаў.
Але таварышы хутка паказалі
Ягонае месца, калі закінулі Беха ў снег.
Ёган не разумеў, як будучыя святары
Маглі яго пабіць.
І за што?
Толькі за тое, што Ёган
Быў разумнейшым за хлопца,
Што лічыцца лепшым.
Гэты адпомсціў яму са сваімі сябрамі.
Толькі цяпер Ёган убачыў,
Што застаўся абсалютна адзін.
Ён і ў выкладчыках расчараваўся даўно,

Бо, аперуючы багаслоўскімі тэрмінамі,
Яны не спазналі Хрыста.
Ёган расказаў аднаму святару пра тое,
Што ён гутарыць з Богам.
З таго часу ўсе запісалі яго ў вар’яты…
Няхай Ёган вар’ят!
Галоўнае, што ў яго ёсць Бог,
Які ніколі не пакіне яго!
Хлапец паваліўся на ложак і,
Абхапіўшы падушку,
Перад Госпадам плакаў:
«Божа! Я ведаю, што Ты любіш мяне,
Але я пакутую праз адзіноту:
Я не магу заглянуць у Твае вочы
І ўбачыць аблічча Тваё!
Мяне гоняць тыя,
Хто павінен пра мяне клапаціцца.
А калі да мяне ставяцца прыязна,
Я ўсё роўна не магу завесці сяброўства,
Бо мне ўжо сябраваць нецікава!»
«Ты хацеў бы ўбачыць Мяне?»
Ёган знерухомеў: з ім размаўляе Гасподзь?
Ён і раней чуў Боскі голас,
Але так выразна, так ярка — ніколі.
Што Яму адказаць? Адмовіць не можа,
А каб убачыць Хрыста,
Трэба пакуты прыняць.
«Хацеў бы... Божа, няўжо
Ты са мной размаўляеш?
Ты такі ціхі і добры».

«Я з табой размаўляю, Ёгане,
Бо люблю цябе і жадаю быць з табой
Усё тваё жыццё».

***

Калі Ёган стаў ксяндзом,
Ён турбаваўся за працу.
Увечар айцец стаў на калені:
«Божа, святар, з якім буду служыць,
Будзе добры?»
«Я кепскіх не даю», — адказаў Гасподзь.
Удзень Ёган прыехаў
Да хаты айца Аскара.
Рахманы старац ветліва ўсміхнуўся,
Завёў пад руку на веранду.
П'ючы гарбату, яны расказвалі пра сябе,
І Ёган сціпла ўзгадаў,
Як з ім размаўляе Гасподзь.
Айцец Аскар прасвятлеў
І пачаў распавядаць,
Якія цуды робіць Хрыстос
У ягоным жыцці.
Ксяндзы ўпадабалі адзін аднаго,
Бех пасяліўся ў хаце са старцам.
Хутка Аскар заўважыў,
Што Бех мае звычку кепска есці
Ці не есці наогул
І позна класціся спаць.
Аднойчы старац зазірнуў
У пакой Ёгана, каб нагадаць пра сон:
«Ужо дзесяць гадзін,

А заўтра рана паднімацца».
Бех перагарнуў старонку кнігі:
«Хвілінку, зараз абзац дачытаю».
Праз гадзіну Аскар ізноў
Зайшоў да Беха:
«Браце, ты збіраешся спаць?»
«Зараз, я амаль дачытаў».
Уранку Ёган адчуў,
Як коўдра слізганула з яго.
Сонныя вочы ўбачылі Аскара ў сутане,
Які трымае ягоную коўдру:
«Хлопча, так і прышэсце Хрыста
Праспаць можна».
«Яшчэ хвіліначку», — зяхнуў Ёган.
Аскар паклаў коўдру на крэсла:
«Хвіліначку можна пачакаць», —
Аскар выйшаў.
Ёган прылёг, але халодныя дрыжыкі
І думка, што словы Аскара
Значылі больш, чым зразумеў Бех,
Не далі ксяндзу заснуць.
Ён пацягнуўся за коўдрай…
І так яму стала сорамна
Перад Богам і Аскарам,
Што адразу ўзняўся,
Пабег уніз па лесвіцы.
Аскара ўжо не было.
Ёган забіўся ў куточак канапы
Не ведаючы, што рабіць.
Але старац хутка вярнуўся.

«Ёгане, чаму ты не еў бліны?
Ты можаш захварэць на гастрыт»,
Напужаныя чорныя вочы Ёгана
З дзіцячым трымценнем
Глянулі на Аскара:
«Дык гэта ж ваша».
«Як гэта маё? —
Шчыра здзівіўся Аскар. —
У першых хрысціянаў
Усё было супольнае,
І калі мы хочам мець сілу
Святога Духа, нашы ўчынкі
Павінны гэта пацвярджаць».
Аскар паставіў бліны на стол,
А Ёган слёзна прасіў
Прабачэнне ў Аскара.
Стары ксёндз ніводнага разу
Не папракнуў яго, толькі сказаў:
«Бог вельмі любіць цябе.
Гэта слова ад Яго».

***

Сёння айцец Аскар
Цяжка служыць імшу.
Ёган бачыць, як дрыжыць
Келіх з віном у старэчай руцэ.
«Божа, — зрываецца
З вуснаў старога ксяндза, —
Не дай мне ўпасці
Перад сходам святых».

Пасля набажэнства Ёган
Вядзе пад руку Аскара дадому.
Старац нямогла
Падае на ложак як быў:
У белых святарскіх адзеннях і ботах.
Беху неспакойна на сэрцы.
Сядае на падлогу,
Кладзе галаву на ложак.
«Ёгане, — Аскар прыгарнуў
Сябра да грудзяў, —
Парадуйся за мяне:
Хутка я буду са Хрыстом на нябёсах.
Напішы пра гэта майму лепшаму сябру
Біскупу Крыштафу Шэфэру».
Ёган хавае слёзы:
«Ты такі добры, што ў цябе ў сябрах
Лютэранскі біскуп.
А я такі адзінокі, што акрамя цябе
Мяне няма каму суцешыць», —
Ёган дрыжыць праз плач.
Аскар задуменна гладзіць валасы сябра:
«Ёгане, калі ласка, прынясі ваду».
Бех скокнуў на кухню, а калі вярнуўся,
Знайшоў Аскара нерухомым.
«Войча?..» —
Ёган паваліўся побач,
Пад белае крыло сутаны настаўніка.
Бех плакаў усю ноч,
А ўранку цела айца Аскара вынеслі.

ПЕСНЯ 4
Сябра для ксяндза

Пасля пахавання айца Аскара
Ёган паваліўся на калені са слязамі:
«Госпадзе, Ты бачыш,
Што я застаўся адзін!
Прашу Цябе, выканай просьбу
Свайго раба і дай мне сябра!»
Хутка Ёгану прызначылі дзяка.
Таму, калі прыехаў Адольф,
Бех узрадаваўся, спрытна адчыніў
Хлопцу дзверы.
Адольф важна ўвайшоў.
За абедам яны размаўлялі
Пра такуюсці-такуюсці булу Папы,
Абмеркавалі трактат аднаго кардынала
І нават закранулі Рэфармацыю.
На парозе з'явіўся Кольман
У пастарскім талары,
З каробкай пад пахай і тазам у руках,
У якім стаіць пірог.
«Вітаю, братове! Я прынёс вярнуць таз».
Ёган радасна падлятае да Кольмана,
Дапамагае паставіць рэчы.
Адольф глянуў на ксяндза:
«Вы сябруеце з ерэтыкамі-сектантамі?»
«Калі айцец Аскар быў з намі,
Кольман аднавіў абраз у касцёле.

Хто я, каб судзіць рабоў
Свайго Гаспадара?»
«У іх адзін гаспадар — Вельзевул!»
«Сцеражыцеся, каб не абразіць
Духа Святога».
«Бог таму і забіў айца Аскара,
Бо той дазволіў сектанту маляваць
Абраз ў касцёле», — злуецца Адольф.
Ёгану здалося, нібыта яго па вачах
Секанулі плеццю.
Ён кідаецца ў свой пакой,
Каб ніхто не пабачыў слёз.
Падае на калені перад абразамі.
«Божа! Няўжо Адольф і ёсць мой сябра,
Якога я прасіў? Не веру, не веру,
Каб Ты падаў Свайму дзіцяці
Замест хлеба камень!»
«Ніколі не падаваў Я каменне.
Ты гэта чытаў у Евангеллі».
Адчыніліся дзверы.
На парозе — пастар Кольман з каробкай.
Ёган чырвонымі праз слёзы вачыма
Азірнуўся на пастара.
Кольман міласэрна паглядае
На разбітага сябра.
Быццам да параненай птушкі
Падыходзіць пастар.
Акуратна ступае ў пакой,
Кладзе руку на плячо Ёгана.

Сядае побач на калені:
«Ёгане, як памёр Аскар?»
Святар закрывае рукамі твар.
Пастар бачыць, як Ёган дрыжыць
Праз рыданні, але не чуе ўсхліпаў.
Ёган зрываецца на зычны лямант.
Калі сэрца суціхла,
Бех скрозь слёзы расказвае,
Як памёр Аскар.
«Дзякуй, што спытаў у мяне
Пра айца Аскара, — скончвае Ёган. —
Я так хацеў пра гэта
Камусьці расказаць».
Абодва хвіліну нерухома сядзяць побач.
«Хочаш, я табе туканятаў пакажу?» —
Кольман адкрывае каробку.
На служыцеляў глядзяць
Дзве цікаўныя дзюбы.
Кольман дае адно птушаняці Ёгану,
Другое бярэ сам.
Пастару падабаецца, як сябар мякка
Абыходзіцца з птушкай:
Ёган асцярожна трымае яе на каленях,
Крыху пабойваючыся доўгае дзюбы.
Птушаняці паўзе на плячо святара
І цікаўна бярэ яркай дзюбай вуха.
«Кольмане, яно хоча мяне з’есці», —
Усміхаецца Ёган.
Пастар перасадзіў тукана ў рукі Беха.

«Птушкі ў гэтым узросце
Асабліва цікаўныя. Трэба сочыць за імі,
Каб яны ў сваіх забаўках
Кудысьці не трапілі».
«Кольмане, ты іх любіш як людзей!»
Кольман усміхаецца:
«Сапраўды, у мяне ёсць Ісус і птушкі!
Яшчэ ёсць біскуп Шэфэр,
Які даверыў мне сваіх выхаванцаў
Кліма і Люцыяна! — усмешку Кольмана
Замяніла задуменнасць: —
Я рад, што я не адзін,
Але не магу падзяліцца з хлопцамі
Сваімі перажываннямі: малыя яшчэ.
Баюся, што іх спужае мой боль.
Але ведаю, што без Боскай волі
І птушка на зямлю не ўпадзе».
Ёган глядзіць у падлогу:
«Я малюся святым, калі мне адзінока.
Маё сэрца радуецца праз думку,
Што на нябёсах у мяне ёсць дом,
Дзе мяне чакаюць».
Сябры спускаюцца ўніз.
Ёган праводзіў Адольфа ў
Ягоны пакой і бачыць,
Як Кольман прытуліўся
Спінай да сцяны, трымаючы птушак.
Пастар узнімае галаву:
«Дзякуй Табе, Божа.

Я столькі гадоў маліўся за сябра,
Які б падтрымаў маё плячо.
Цяпер я веру, што Ты сапраўды
Ніколі не падасі дзіцяці камень
Замест хлеба.
Даруй, што ўсумніўся ў Табе».

***

Ёган і Кольман ідуць па дарозе да кірхі.
«Кольмане, ты не спознішся,
Калі мы прагуляемся ў полі?»
«Не спазнюся. Яшчэ ёсць час».
Сябры збочылі з дарогі на поле,
Асветленае ў ружовы колер захаду.
Ёган перажывае:
«Што я буду рабіць,
Калі застануся адзін?
Мой новы дзяк — сапраўдны езуіт.
Мне душна знаходзіцца
З ім у адным пакоі».
Кольман ветліва падбівае
Сябра пад локаць.
«А ты ўсё роўна любі яго.
Адольф таксама адзінокі чалавек».
Ёган прайшоў з Кольманам
Да канца поля. Пастар уздыхае:
«Можна папрасіць пра адну справу?
Калі мяне ўжо не будзе,
Дашлі ліст майму настаўніку
Біскупу Крыштафу Шэфэру,

Які я пакінуў на пісьмовым стале.
І прыгледзь за Клімам і Люцыянам, —
Пастар выпускае руку Ёгана. —
А вось і мая сцежка. Мне час ісці».
Бех глядзіць на постаць,
Якая ідзе ўдалечынь свету.
Кольман памахаў сябру рукой
І ідзе далей, пакуль кволая постаць
Не знікае ў прасторы.

КНІГА 3

ЧАС ЗЛАМАНАГА КРЫЖА

«Калі хто хоча ісці за Мною,
Хай адрачэцца ад сябе
І возьме крыж свой
І ідзе за Мною»

Мацвея 16:24

ПЕСНЯ 1
Пані Канрадайн

Наглядчыцы паганяюць
Кабет у канцлагеры.
Вязніцы рыдлёўкамі збіраюць
Ваду з луж пасля начной буры,
Бо сёння прыедзе высокае начальства.
Адвакат Канрадайн Фішэр
Цэлы дзень стаіць па костачкі ў брудзе.
Ейныя паплечніцы разышліся
Як авечкі па полі
І забылі пра пільную наглядчыцу Шнайдэр.
Сінія вочы адваката Канрадайн
Ходзяць пад сівымі брывамі,
Цікуючы за вязніцамі і наглядчыцамі.
Шнайдэр падышла да мілай дзяўчыны
Мары, якая абапёрлася аб рыдлёўку
І цяжка дыхае.
«Чаму не працуем?» — крычыць Шнайдэр
І ловіць цяжкі погляд Канрадайн,
Якая замерла з вадой у рыдлёўцы,
Пільна слухаючы размову.
Мара схапіла прыладу і стала раўняць
Камкі зямлі на дарозе.
Калі Шнайдэр адышла,
Канрадайн скокнула да Мары,
Схапіла ейнае плячо:
«Мара, калі ты не можаш працаваць,

Рабі хаця б выгляд!»
«Я думаю, што гэта кабета нязлая.
Урэшце рэшт, у яе таксама ёсць дзеці».
«О, наіўнае дзіця! —
Пляснула рукамі Канрадайн
І жанчыны навокал паабарочваліся. —
Няўжо ты забыла, як гэтыя, —
Паказвае пальцам на Шнайдэр, —
Кінулі цябе эсэсаўцу,
І цяпер ты цяжарная капаеш дарогі!
Ты думаеш,
Яны пашкадуюць тваё дзіцяці?
Мара! Хіба ты не ведаеш,
Што мяснікі вельмі дбаюць
Пра сваіх цялушак,
Але гэта не замінае
Бязлітасна рэзаць чужых!
І паляўнічы шкадуе свайго сабаку,
Але ў яго не дрыжыць дула стрэльбы,
Калі ён цэліць ў воўка!»
Канрадайн бачыць,
Што на вачах Мары збіраюцца слёзы.
Пані Фішэр абнімае дзяўчыну:
«Ну-ну, не плач.
Нямеччына абавязкова
Прайграе ў вайне,
І тады мы ўсе будзем свабодныя, —
Яна ўглядаецца ў чорныя вочы Мары.
На схуднелым твары Канрадайн

З сапсанавым носам
З’яўляецца ўсмешка й слёзы, —
Мы ўсе будзем свабодныя:
І ты, і тваё дзіцятка… і я».
Да Шнайдэр нехта падбягае:
«Пані Герман просіць Фішэр».
Наглядчыца гукае адваката Канрадайн.
Яны ідуць поруч па бруднай дарозе.
«Вы – адвакат? — рычыць Шнайдэр. —
За што вы сядзіце?»
«За адвакацтва й сяджу, —
Абыякава адказвае Канрадайн. —
Аказваецца, не ўсіх людзей
Можна абараняць.
А я, наіўная, думала,
Што кожны чалавек варты літасці
Толькі таму, што ён — Чалавек!»
Шнайдэр стукнула дручком
Па спіне адваката:
«Не смейся з мяне, Фішэр!»
Вузкія вусны Канрадайн
Праз боль ўціснуліся,
Лоб зморшчыўся:
«Добра, не буду».

***

Начальніца канцлагера пані Герман
П’е каньяк з эсэсаўскім панам.
Уваходзіць пані Шнайдэр
З адвакатам Фішэр.
«А вось і наша сапсаніха,
Пра якую я табе апавядала», —
Смяецца нізенькая кабета Герман
Свайму прыяцелю.
«Мне цікава зірнуць на мужчыну,
Які ажаніўся з ёю», —
У тон сяброўцы адказвае эсэсавец.
Канрадайн стаіць моўчкі.
«У яе муж — пастар! — кажа Герман. —
Пастар і ілжэсведка!»
«Бог не ўзнагародзіў
Сумленную жанчыну
Сумленным мужам», —
Блюзнерыць эсэсавец.
«Пэўна, Яму сумленныя
Не надта патрэбны, —
Усміхаецца Герман і
Падпірае рукой галаву: —
Ну, Канрадайн, раскажы,
Чаму твой Бог цябе не ўратаваў!»
Пані Фішэр падціснула вусны,
Апускае вочы ў падлогу.
Маўчыць.
«Як ты не адказваеш на пытанні! —

Узвіваецца Герман,
Паварочваецца да прыяцеля: —
Колькі ў Рыме давалі ўдараў?»
«Сорак без аднаго».
«Шнайдэр, — узмахнула рукой Герман, —
Ты бі яе, а я буду лічыць!
Толькі не над маім персідскім дыванам,
Калі ласка!»
Канрадайн зняла куртку
І Герман пачала лічыць:
«Адзін, два, тры… стоп! Я збілася!
Прыйдзецца спачатку!
Адзін…
Два…
Тры…»
Тройчы Герман збівалася і тройчы
Пералік пачынаўся з пачатку,
Шнайдэр дабівае апошнія ўдары,
Калі Канрадайн ляжыць на паркеце.
«Калі ласка, памірай дзе заўгодна,
Толькі не тут!» — Герман торкае ботам
У знясіленае цела.
На дзіва ўсім прысутным,
Пані Фішэр сама паднялася,
І Шнайдэр павяла Канрадайн у барак.
«Якое добрае надвор’е! —
Глядзіць у неба Канрадайн. —
Цэлы дзень працавала і не заўважала,
Што на небе ані воблачка!

Вось гляджу на аблокі
І ўспамінаю бацьку.
Ён быў міністр —
Сумленны і пабожны чалавек!» —
На твары Канрадайн заззяла
Дзіцячая ўсмешка.
«Ты праз боль звар’яцела», —
Бурчыць Шнайдэр.
«Гэта вельмі дзіўнае адчуванне,
Калі ты адчуваеш боль,
Але гэты боль
Не прасочваецца ўнутр цябе,
І ты не адчуваеш пакуты!»
Ногі Канрадайн абнядужалі,
Адвакат з’ехаў на калені.
«Тут да баракаў крыху засталося», —
Наглядчыца цягне адваката за локаць
Але Канрадайн павалілася,
Апошні раз уздыхнуўшы.

ПЕСНЯ 2
Вучаніца Канрадайн

Канрадайн памятае, як яна
Прыйшла ў турму да біскупа Шэфэра:
Адвакату трэба было спытаць
Падрабязнасці, дзякуючы якім
Можна будзе ўратаваць служыцеля.
Скатаваны на допыце Шэфэр
Згадаў Пісанне:
«„Калі ж павядуць выдаваць вас,
Не турбуйцеся загадзя, што вам сказаць,
І не абдумвайце,
А што дадзена будзе вам у тую часіну,
Тое і кажыце,
Бо не вы будзеце гаварыць,
А Дух Святы“, —
Збіты біскуп цяжка ўздыхнуў: —
Не збярог я тваю сям’ю:
Твае стрыечныя браты Рудольф і Астор,
Якіх я даглядаў, памерлі, іхнія сыны —
Таксама…»
«Але Клім жывы, хаця і ў канцлагеры».
«Думаю, яму не выбрацца адтуль,
Як і майму добраму сябру
Каталіцкаму дзяку Адольфу.
Добра, што ксяндза Ёгана
Не арыштавалі, і добра,
Што брат твайго мужа

І твой сябар Кольман
Не дажыў да гэтых падзей.
І яшчэ добра,
Што Люцыян уцёк у Швейцарыю…
І пасля гэтага ты хочаш рызыкаваць
Сваім жыццём дзеля Госпада?»
«Хачу», — сцвярджае адвакат Канрадайн.
Біскуп сумна ўсміхаецца. Маўчыць.
Канрадайн заўважае,
Што ён не дыхае.

ПЕСНЯ 3
Пастар Фішэр

Пастар Альберт Фішэр
Прыйшоў у кірху з падлеткамі.
Дачка Берта сябруе
З астарбайтэрам Кастусём,
Якому Канрадайн дала прытулак.
Хлопца з-пад Брэста прывезлі захопнікі.
Канрадайн забрала яго, бо Кастусь
Падчас паездкі падхапіў сухоты,
І доўга б не пражыў.
Кастуся прадалі танна
(Ён схуднеў і ўжо не мог хадзіць)
І Канрадайн на руках дацягнула
Хлопца да машыны. Ехалі моўчкі.
Пастар Фішэр не быў задаволены:
Ён думаў, што жонка набудзе
Служку ў хату. А Кастусь
Ледзь не паміраў.
Канрадайн накрычала на мужа,
Што ён не пастар, а рабаўладальнік.
У добрых умовах Кастусь
Хутка паправіўся,
Канрадайн вучыла беларуса
Нямецкай мове.
Але ў руска-нямецкім слоўніку
Былі не ўсе словы,
Якімі карыстаўся Кастусь.

Хлопец сказаў, што ён беларус,
А мова яго — беларуская.
Ён адужэў гэты слоўнік
І добра засвоіў нямецкую мову.
Цяпер Канрадайн адвакатуе ў судзе.
Пастар Фішэр, Берта і Кастусь
Падыходзяць да статуі Хрыста.
Ісус схіліўся пад цяжарам крыжа.
На грудзях чорнай фарбай
Намалявана свастыка,
А на п'едэстале — надпіс:
«Бог быў арыец».
«Хто гэта зрабіў?!» — дзівіцца Кастусь.
«Гэта як мінімум — вандалізм,
А як максімум — хлусня!» —
Абураецца Берта.
«Дзеці, ціха!
Сёння прыехалі паны з СС», —
Супакойвае падлеткаў бацька.
Берта — у штыкі:
«І што? Ты здрадзіш Хрысту перад імі?!»
«Берта, —
Цярпліва папраўляе акуляры Альберт, —
Я згодны з табой, што гэты надпіс — жах.
Але што мне зрабіць?
Я — маленькі пастар!
Я, канешне, магу асудзіць
Гэта ў пропаведзі,
Але мяне ўсё роўна ніхто не паслухае.

Царкву зачыняць, мяне — пасадзяць.
Хто вас будзе карміць? Мама?
Яна ўжо адной нагой за кратамі,
Бо абараняе палітвязняў на судах!»
Пастара паклікаў нехта з начальнікаў.
Фішэр пабег, падлеткаў пакінуўшы.
«Змірыцца з нацысцкім рэжымам?
Ніколі! — сячэ Берта. —
Пакуль у краіне папіраецца Бог,
Яна не будзе краінай для жыцця!» —
«Што будзем рабіць?» —
Пытаецца Кастусь.
«У падвале ёсць жоўтая фарба.
Пайшлі прасіць у вахтора ключы».

***

Падчас набажэнства пастар Кёлер
Сядзіць з Кастусём і Бертай
На кухні царквы, п’ючы гарбату.
Падлеткі любяць пастара Кёлера
За ягоную цеплыню і мяккасць.
Кастусь прытуліўся да ягоных грудзяў,
Апавядаючы сваю гісторыю.
Старэчыя вочы ціха глядзяць на хлопца.
«…З таго часу, як майго бацьку
Завезлі ў сталінскі лагер,
Я яго больш не бачыў.
А судзілі яго толькі за тое,
Што ён — праваслаўны святар!
Тату пасадзілі, царкву разбурылі,

Я застаўся з маці і сястрычкамі.
Потым нашую вёску спалілі немцы,
А мяне прывезлі сюды, на Нямеччыну.
Што мне тут рабіць, войча Кёлеру?»
«Ты звярнуўся няправільна,
Зварот „айцец“ —
Праваслаўны перажытак», —
На парозе — багаслоў пастар Андэр
(Ён толькі вярнуўся са сходу).
Берта прыжмурылася
З іранічнай усмешкай:
«Сапраўды, быццам да Мартына Лютэра
Хрысціянства не існавала!»
«Пастар табе не айцец, а брат, —
Працягвае Андэр. —
Бо ў Бібліі напісана…»
«Андэру, — кажа Кёлер, — не цісні дзіця.
Хлопец бацьку страціў
У сталінскім лагеры.
Ён як святар не адмовіўся ад Бога,
Аддаў жыццё за Хрыста. Сумняваюся,
Што мы з табой перанеслі б такое».
Андэр заклаў рукі за спіну:
«Пакінем гэную спрэчку, бо ў нас бяда.
Нехта замаляваў свастыку
На грудзях Хрыста,
І намаляваў паверх зорку Давіда».
«Падумаеш, бяда вялікая, —
З палёгкай уздыхае пастар Кёлер. —

Я думаў, нешта сур’ёзнае».
«Гэта па-твойму несур’ёзна?! —
Наваліўся Андэр. —
За гэта нас усіх у канцлагер пасадзяць!»
Пастар Андэр выйшаў і стукнуў дзвярыма.
Кастусь хавае збялелае аблічча рукамі:
«Берта, што ж мы зрабілі!»
«Тое, што павінны былі!» —
Яна пераможна хлопае хлопца па спіне.
«Рабяты, дык гэта вы ўчынілі?!» —
Палохаецца пастар Кёлер.
«Вы ж не скажаце?» — Берта радасная,
Бо да яе не дайшоў сэнс словаў пастара.
«Канешне не скажу!»

ПЕСНЯ 4
Праблема сям’і Фішэраў

Альберт Фішэр з падлеткамі
Едзе забіраць Канрадайн.
Усе трое сядзяць збялелыя.
  «Хтосьці вас бачыў?» — пытаецца тата.
  «Толькі пастару Кёлеру распавялі», —
Берта ледзь размаўляе:
Нарэшце і яна ўсвядоміла
Цяжкасць становішча.
  «Навошта? Ён жа дасць паказанні!» —
Пужаецца бацька.
  «Ён абяцаў маўчаць, пастару Фішэру», —
Кастусь таксама баіцца.
  «Калі на допыце яму пад ногці
   Загоняць іклы, пастар Кёлер
   Будзе сведчыць!» —
Галава Фішэра працуе хутка,
Малюючы гестапаўскі падвал
І страшэнныя прылады катавання,
Якімі будуць мучыць Альберта
І ягоную сям’ю.
Што рабіць? Ёсць сведка!
Ён абмяркуе гэта з Канрадайн:
Яна разумная, нешта прыдумае.
Пастар і дзеці пад’язджаюць
Да будынку суда.
З брамы выходзіць Канрадайн.

За ёй — пракурор.
Яна сёння радасная, абнімае падлеткаў,
Хлопае па плячы мужа і кажа:
«Сёння мы перамаглі!»
Побач праходзіць пракурор Лянге:
«Пані Канрадайн,
Па вас самой даўно гільяціна плача».
Калі Фішэры селі ў машыну
І муж расказаў пра свастыку,
Усмешка адваката знікла.
«Ну што я магу сказаць, —
Разводзіць рукамі кабета, —
Будзем чакаць!»
«Чакаць, калі нас пераб'юць?» —
Альберт палахліва глянуў на жонку.
«Будзем чакаць і маліцца.
У Госпада ніводная птушка не забыта,
І уся гэта гісторыя ў Ягонай руцэ».
Увечар Альберт нічога не еў.
Ён пайшоў на раду да Андэра.
Дамовіцца, як яны будуць сведчыць.
Багаслоў Андэр прапанаваў
Зрабіць Кёлера крайнім.

ПЕСНЯ 5
Праблемы паглыбляюцца

Праз два дні на парозе дома Фішэраў
З’явіўся слядак Цымерман —
Інстытуцкі прыяцель Канрадайн.
Адвакат гасцінна прымае таварыша:
«Вазьмі блін, бо я гляджу,
Што цябе дзяўчаты зусім не кормяць!» —
Прыжмурваецца кабета
І Цымерман заўважае,
Як Берта падобна да маці.
Слядак чырванее:
Канрадайн з тых нешматлікіх,
Хто ведае яго паднаготную.
Прызнацца, яму сорамна перад ёй,
Бо Канрадайн заўсёды была правільнай.
Яны размаўляюць пра юрыспрудэнцыю,
Пра справы, пра студэнцкія гады,
Абыходзячы прычыну візіту.
Цёмна-сінія вочы Канрадайн
Супраць шэра-зялёных:
Цікуюць адно за адным.
«Што хавае Канрадайн? —
Думае Цымерман. — Відавочна,
Што Фішэры маюць нейкае дачыненне
Да справы са статуяй».
«Госпадзе, чаму ён прыйшоў? —
Моліцца Канрадайн. —

Па справе са свастыкай?
Што яму пра нас вядома?»
«Давайце да справы, —
Цымерман кідае папку на стол, —
Што ў вас адбылося ў царкве?»
Канрадайн не гатова адказаць.
Умешваецца спалоханы Альберт:
«Яна не ведае! Яе там не было!» —
Дрыжыць пастар.
Канрадайн хмурыцца:
Муж адсек яе ад размовы.
Адвакат паднімаецца наліць кампот,
Становіцца за спіну госця.
Альберт працягвае:
«Я быў там… Я прапаведаваў
І бачыў праз акно,
Як пастар Кёлер нешта
Мудрыў на помніку».
Канрадайн ураніла чарпак у каструлю,
З-за спіны следчага
Махае востым кулаком мужу.
«Слухай, — узрушана кажа
Адвакат следаку, —
Хіба стары Кёлер залезе на статую?»
Цымерман па-лісінаму ўсміхаецца:
«Гэтага я не ведаю.
Але вось пратакол нашай размовы
З пастарам Андэрам,
Які сведчыць тое ж, што і твой муж», —

Цымерман дастае аркушы з папкі.
Канрадайн строга глядзіць на Альберта.
Яму не па сабе.
«Як ты змог падставіць свайго брата! —
Канрадайн схапіла з падаконніка
Біблію ў скуранай вокладцы. —
Суддзя выносіць прыгавор злачынцу
І абапіраецца на закон,
Так што не чалавек судзіць яго, а закон!
Гэтак і цябе, настаўніка Боскага народу,
Не сам Бог будзе судзіць,
А Ягонае слова, якое цябе называе
Ілжэсведкам і ілжэпастарам!
Гэта не Канрадайн табе сказала —
А сам Хрыстос у Пісанні!»
Адвакат робіць паўзу, аддыхваецца.
Альберт падскоквае да жонкі,
Мякка бярэ цвёрдую руку:
«Мілая Канрадайн, мы адна сям’я,
Таму павінны дзейнічаць разам».
Пані Фішэр адштурхвае мужа:
«І разам памерці за тваю хлусню,
Як Сапфіра з Ананіем!»
Яна пайшла ў свой кабінет.
Лязгнуў замок.
Канрадайн чула, як Альберт
Мілосна праводзіў Цымермана.
Ёй брыдка. Проста брыдка,
Што яна калісьці

Звязалася з гэтым чалавекам,
З гэтым Альбертам.
Адвакат аглядае свой кабінет:
Багаты пісьмовы стол,
Шафы з хрустальным посудам
І старымі кнігамі.
Гэта кабінет ейнага бацькі — міністра.
Ён быў вядомы як добры
І справядлівы чалавек,
Які дапамагаў жабракам,
Удовам, сіротам.
І выхаваў Канрадайн,
Сваё адзінае дзіця,
Сумленнай дзяўчынай.
Яна прыняла ў бацькоўскі дом Альберта
Маладзейшага за яе на дзесяць гадоў,
Узяла ягонае прозвішча.
І вось які ейны муж!
Канрадайн плача.
Яна знімае заручальны пярсцёнак,
Круціць у руках, кідае —
Пацэліла ў гаршчок з фікусам.
Не патрэбны ёй такі муж!
Сёння ж яна выставіць
Альберта за дзверы!
Пастар тым часам
Сутыкнуўся ў калідоры з падлеткамі.
Берта плача:
«Тату, я ад цябе такога не чакала».

Бацька даўно не бачыў яе такой.
Кастусь апускае вочы,
Пазбягаючы погляду пастара Фішэра.
«Рабяты, пачакайце!»
Позна: падлеткі пашыбавалі ў залу.
Альберт толькі што ўсвядоміў,
Што зрабіў.
Бяжыць угору па лесвіцы
У кабінет Канрадайн.
Бярэцца за ручку — зачынена.
«Канрадайн, прашу цябе, адчыні!
Госпадзе, я зрабіў страшную памылку!»
Канрадайн не адчыняе. Альберт ведае:
Калі ягоная жонка прыняла
Рашэнне не адчыняць —
Значыць і не адчыніць,
Колькі б ён не плакаў пад дзвярамі.
Ён валіцца на прыступку,
Прытуліўшыся спінай да дзвераў,
І плача:
«Госпадзе, што я нарабіў?! Я — забойца!
Божа, я сапраўдны забойца!
Я сваім языком кладу
Чалавека пад гільяціну!
Не можа з адной крыніцы ліцца
Салодкая і горкая вада,
А я гэтымі вуснамі ліслівіў эсэсаўцам,
Прапаведаваў за кафедрай
І цяпер імі ж забіваю чалавека!

Ці Табе я служыў? Не! Даруй мне,
Госпадзе, хаця я таго не варты!»
Дзверы адчыняюцца.
На парозе —
Канрадайн з заплаканымі вачыма.
Ейны погляд цвёрды.
Альберт заўважае,
Што на руцэ няма пярсцёнка.
Усё. Гэта ўсё.
Цяпер ён абсалютна адзін.
Ён закрыўся рукамі, каб Канрадайн
Не пачула ніводнага ўсхліпу:
Яна цярпець не можа,
Калі ціснуць на ейныя пачуцці.
Жонка сядае побач:
«Ну што, Альберце, пакаяўся?»
Пастару здаецца,
Што жончын тон памякчэў.
Ён асцярожна паднімае галаву,
Каб краем вока пераканацца ў гэтым.
Сапраўды, на твары Канрадайн
З'явілася слабая ўсмешка.
Яна абняла рукой ягоныя плечы.
Альберт баіцца варухнуцца
І сказаць лішняе.
Ён усё яшчэ занепакоена
Паглядае на жончыны пальцы
Без пярсцёнка:
«Канрадайн, што нам цяпер рабіць?!»

Яна задумалася, адказвае:

«Я зараз паразмаўляю з Цымерманам.
Калі не ўгавару прыкрыць Кёлера,
Тады буду абараняць яго ў судзе, —
Раптам вочы Канрадайн усміхнуліся. —
Але спачатку дастану пярсцёнак
З нашага фікуса».

ПЕСНЯ 6

Справа пераходзіць на новы ўзровень

Пані Фішэр з’явілася ў гестапа.
Яна чакала пад кабінетам Цымермана,
Пакуль не вярнуўся слядак.
«Цымерман, паслухай…»
«Не, Канрадайн, я не адпушчу Кёлера
Нават калі ты дужа папросіш.
Радуйся, што я не ператрэс тваю сям’ю,
Бо вы, пэўна, ведаеце болей,
Чым распавёў твой муж».
«Пастар Кёлер сапраўды невінаваты».
«Ведаю, што невінаваты.
Але што я магу зрабіць?
Ён добраахвотна прызнаўся.
А мне толькі і трэба,
Каб закрыць гэту справу».
«Ён тут, у гестапа?
Я магу з ім пабачыцца?
Хачу выступіць адвакатам на судзе».
Цымерман вядзе Канрадайн па лесвіцы.
Адчыняе дзверы камеры.
На падлозе ляжыць
Непртытомны пастар Кёлер.
«Браце, што з табой зрабілі!» —
Здрыганулася Канрадайн.
Яна асцярожна трасе пастара,
І Кёлер расплюшчвае вочы.
«Сястра Канрадайн?
Яны што… і цябе сюды?»

«Не, я прыйшла як адвакат», —
Канрадайн усаджвае пастара на нары.
Кёлер хапае разбітую галаву.
«Канрадайн, прашу, не ўмешвайся:
У цябе — сям’я».
«Дастаткова абаранялі сваю сям’ю.
Ты ведаеш паклёпнікаў?» —
Сінія вочы глядзяць на пастара.
«Следчы сказаў пра здраду
Альберта і Андэра,
Але я да апошняга сумняваўся.
Думаў, што Цымерман
Грае на маіх пачуццях».
Канрадайн падае на калені
Перад пастарам.
«Даруй нам! Альберт каецца!»
«Усё добра Канрадайн,
Я не трымаю крыўды.
Мабыць і я, апынуўшыся
Ў становішчы твайго мужа,
Зрабіў гэта ж».
Яны развітваюцца
І Канрадайн выходзіць,
Выпадкова ўдарыўшы дзвярыма
Цымермана, які прытуліўся вухам
Да замочнай шчыліны. Адвакат чуе,
Што Кёлер пачынае плакаць:
«Альберце, Андэру, чаму вы здрадзілі?
Чаму вы прадалі Хрыста?»
Для Канрадайн гэта нож па сэрцы.

***

Ноччу яна стаіць на каленях.
«Божа, што мы зрабілі?!
Шчасце на крыві не пабудуеш ніколі!
Даруй нам, што пакінулі Цябе
І пайшлі сваімі шляхамі будаваць
Свой дом, а не Твой!»
Канрадайн выраніла Біблію.
Старонка разгарнулася
На кнізе прарока Аўдзея:
«І пераселеныя з войска
Сыноў Ізраілевых завалодаюць
Зямлёю Хананейскаю да Сарэпты,
А пераселеныя з Ерусаліма,
Якія ў Сефарадзе,
Атрымаюць у валоданне
Гарады паўднёвыя».

ПЕСНЯ 7
Адвакат Канрадайн

Чыніцца суд над пастарам Кёлерам.
Альберт Фішэр адмовіўся
Ад сваіх паказанняў, і замест яго
Знайшлі новых ілжэсведкаў.
Пастар Андэр разам з імі.
«Браце Андэру, — умаляў Альберт, —
Скажы, што мы змовіліся».
«Каб мне разам з табой
Гніць у канцлагеры!
А хто будзе ў нашай кірсе служыць?
Няўжо пастар Кёлер? Ну не!
Хай адзін чалавек загіне за народ!»
Суд пачынаецца.
За кафедрай адваката —
Пані Канрадайн Фішэр.
Суд пачаўся не так, як яна разлічвала.
Спачатку слова ўзяў пракурор Лянге.
Ён упарта ідзе наперад,
Бэсцячы Кёлера. Канрадайн разумее,
Што лёс пастара ўжо прадвырашаны,
А калі так — ад адваката
Нічога не залежыць.
Ці залежыць?
Ім толькі патрэбна кроў чалавека.
Лянге крычыць:
«Гэты ілжэпастар Кёлер начытаўся
Яўрэйскіх паданняў

І разбурае нашу краіну! —
Пракурор хітра ўсміхнуўся: —
Ці гэта быў не ён? Што скажуць сведкі?
Пастару Андэру!»
«Я стаяў там і бачыў яго
З банкай жоўтай фарбы…» —
Андэр маляўніча апавядае,
Як стары пастар узлез на помнік,
Каб замаляваць свастыку.
Канрадайн слухае ілжывую байку,
П’ючы са стакана ваду.
Яе погляд апусціўся на Кёлера:
Ён выцірае вочы рукой.
Андэр скончыў.
Фішэр лязгнула стаканам аб кафедру.
«Пане суддзя, можна пытанне сведку?»
Суддзя ляніва паварочвае галаву да яе:
«Можна».
Канрадайн склала рукі на кафедры,
Пільна ўзіраецца ў Андэра:
«Слухай, Андэру.
Ты сказаў, што стаяў побач з Кёлерам.
Чаму ты яго не спыніў?»
«Ваша пытанне
Не мае дачынення да справы», —
Бурчыць суддзя.
Адвакат радуецца:
Андэр пужліва апусціў галаву,
Разам з ім іншыя сведкі хаваюць вочы,
Бо баяцца казаць і будуць маўчаць.

Пракурор Лянге гнеўна глядзіць на яе:
Фішэр сапсавала ягоную песню!
«Пане суддзя, дазвольце запытаць
Пастара Фішэра», — просіць Лянге.
«Пытайцеся!» — суддзя паблажліва
Усміхаецца пракурору.
Лянге драпежна глядзіць
На пастара Фішэра:
«Чаму вы адмовіліся
Ад сваіх паказанняў?»
Альберт падняўся.
Складзеныя рукі ў замок дрыжаць.
«Мы з Андэрам спужаліся,
Што падазрэнні будуць на нас,
Таму падставілі пастара Кёлера».
Кёлер ласкава ўсміхнуўся Альберту.
Альберт адчувае, што зараз заплача.
Лянге з'едліва глядзіць на Фішэра:
«Пастару, вы ведаеце,
Што можаце сесці за ілжэсведчанне?»
Пастар Фішэр валіцца непрытомны.
Канрадайн сціскае борцікі кафедры.
Назірае, як яе мужа
Прыводзяць у пачуцці
І выводзяць з залы.
Лянге скоса паглядае на пані Фішэр:
Ён задаволены сваёй помстай.
Суддзя ківае пракурору, хвалячы Лянге.
«Ну, пані Фішэр, — усміхаецца суддзя, —
Вы таксама мяркуеце,

Што злачынца не пастар Кёлер?»
Канрадайн прыходзіць у сябе:
«Гэта быў не ён».
«Сапраўды? —
Нібыта здзіўляецца суддзя, —
Чаму ж ён прызнаўся?»
Канрадайн убірае ў грудзі паветра.
«Таму што пастар Кёлер —
Сапраўдны Хрысціянін.
І, як Хрыстос, ён гатовы аддаць
Сваю душу за жыццё іншага чалавека,
Таму ўзяў на сябе чужую віну».
«Гэта так, пастару Кёлеру?»
«Так, гэта праўда».
«Атрымліваецца, вы пакрываеце
Сапраўдных злачынцаў!»
Пастар Кёлер паднімаецца:
«Сапраўды, я пакрываю злачынцаў.
Хіба Хрыстос не зрабіў гэта ж?
Ён Бог, Які прыйшоў на зямлю,
Каб пакрыць нашы грахі Сваёю Крывёю.
І Яго праз зайздрасць
Раскрыжавалі з разбойнікамі,
Хаця Ён не зрабіў аніякага грэху.
Я таксама злачынец перад Богам,
Але я хачу змяніцца,
Каб быць падобным да Яго».
Канрадайн з усмешкай
Глядзіць на рахманага пастара,
На сініх вачах збіраюцца слёзы.

Але слова не кранула
Ні суддзю, ні пракурора.
«Вы нас усіх называеце злачынцамі, —
Крычыць Лянге, —
І гэтым нас вельмі крыўдзіце».
«Гэта не я кажу, — Кёлер глядзіць
Светлым абліччам на пракурора, —
Гэта гаварыць мая Біблія».
«І нам яшчэ патрэбны сведкі?! —
Лямантуе Лянге. — Ён назваў
Пракурара і суддзю злачынцамі!»
«Але вы аддаяце на згубу невінаватага, —
Прамовіла Канрадайн. —
У вас няма ніводнага доказу
Супраць пастара Кёлера,
І няма аніводнага сапраўднага сведкі!»
«Чаму вы ўпэўнены ў гэтым,
Пані Фішэр? — яхіднічае Лянге. —
Мабыць, вы самі ведаеце злачынцу?»
Канрадайн абвяла позіркам залу.
«Ведаю! Гэта я намалявала зорку Давіда
На грудзях Хрыста!»
Зала замерла.
Пракурор і суддзя пераглянуліся.
«Але ў гэты час вы былі на судзе, —
Пярэчыць Лянге. — Я памятаю гэта!»
Суддзя зрабіў знак рукой пракурору,
Каб той маўчаў.
«Вы не адмовіцеся ад прызнання?» —
Пытаецца суддзя.

«Не адмоўлюся».
«Нават калі вам прысудзяць казнь?»
«Я не адмоўлюся нават тады,
Калі мая галава будзе ў пятлі віселіцы
Ці над кошыкам гільяціны».
Аб’явілі перапынак.
Суддзя тэлефануе высокім панам з СС.
Прыйшоў загад:
Перагледзіць справу і пасадзіць
Канрадайн Фішэр,
Каб яна больш не замінала на судах
Сваім адквакацтвам,
А Кёлера — адпусціць.
Хутка Канрадайн
Трапіла за краты. І Цымерман
Хутка сфабрыкаваў справу
І перадаў ў суд, апошні суд Канрадайн,
Дзе пракурор Лянге нагадаў ёй
Усе свае кар’ерныя няўдачы.
А Фішэр сядзела схіліўшы галаву
І не слухала яго, бо ўсе
Ейныя думкі былі заняты сям’ёй:
Як яны там?
Але да Фішэраў больш з гестапа
Не прыходзілі.
Канрадайн прысудзілі канцлагер,
Які стаў апошнім прыпынкам
Зямнога вандравання адваката.

ПЕСНЯ 8

Зорка на Хрыстовых грудзях

Гэтым ранкам пастары ідуць ў кірху.
Кёлер суцяшае Альберта,
Берту і Кастуся
Пасля страты Канрадайн,
(З канцлагера даслалі ейныя рэчы
З паведамленнем, што яна нібыта
Памерла праз сухоты).
Андэр ідзе ззаду.
«Глядзіце!» —
Берта паказвае пальцам на месца,
Дзе стаяла кірха.
Замест царквы засталіся развалiны.
Ноччу на кірху ўпала
Бомба і разбурыла яе.
Слава Богу, што ў ёй нікога не было.
Застаўся толькі помнік Ісусу Хрысту
Абсалютна не пашкоджаны.
Хрыстос хіліцца пад цяжарам крыжа,
Рушыць наперад па п’едэстале,
На якім напісана:
«Хрыстос таксама быў яўрэй,
Каго мы гонім?»
А на грудзях Ісуса ззяе зорка Давіда,
Якую неаднойчы замалёўвалі
Шэрай фарбай,
Але кожны раз зорка прабівалася

Скрозь шэрыя плямы.
«Якая была кірха!» —
З вачэй Андэра капаюць слёзы.
«Мы пабудуем новую», — кажа Берта.
Росквіт афарбоўвае былую кірху
Ў ружовы колер святла.
Хай сонца праўды заззяе
Над нашымі цэрквамі!

ПЯСЧАНІК

Чырвоны мур уніяцкага касцёла
Адмежаваў дворык з раслінамі
Ад гарадской сумятні.
Айцец Якуб працірае
Келіхі пасля набажэнства.
Уваходзіць айцец Ясь.
Ясевы вочы ацэньваючым поглядам
Абводзяць памяшканне.
Якуб апусціў позірк на чарачку.
Ясь хлопае калегу па спіне:
«Ну, дружа, добра набажэнства зладзілі.
Прыгожа і з густам».
Якуб ціха адстаўляе посуд —
Бярэ талерачку.
«Ты ні халодны, ні гарачы, —
Ціха кажа Якуб. —
О, калі б ты быў халодны альбо гарачы!
Але як што ты цёплы,
А не гарачы і не халодны,
Дык выкіну цябе з вуснаў Маіх».
Вострыя Ясевы вочы глянулі на Якуба.
«Панабіраюць тут усякіх з вёсак
Без багаслоўскай адукацыі, —
Бурчыць Ясь, — Дык яны думаюць,
Што могуць сыпаць цытатамі з Біблііі
Дзе ім заўгодна!»
Якуб рахмана сутуліцца,
Але сардэчнае полымя

Пячэ косткі ксяндза.
Ён не мае ніякага права маўчаць,
Хаця хоча скончыць размову:
«Дух дыхае, дзе хоча,
І голас ягоны чуеш,
А не ведаеш, адкуль прыходзіць
І куды сыходзіць».
Якубу здалося,
Што Ясь замахнуўся —
Вясковы святар уціскаецца.
Але Ясь крутануўся
І рушыў да дзвераў.

***

Айцец Якуб ідзе за горад.
Ён любіць гуляць ноччу па лесе.
Прыемна глядзець угору
На неба і думаць пра Таго,
Хто стварыў небасхіл,
Хто саткаў яго,
Маленькага ксяндза Якуба.
Даў яму імя, характар і талент.
Ногі святара тонуць у гурбах снегу.
«Якубе, — кажа Бог, — там чалавек».
Які чалавек? Якуб не разумее.
Што тут рабіць чалавеку ўначы?
Ці сапраўды Госпад вымавіў гэта слова?
Ногі самі панеслі ксяндза па дарозе.
Тут, сярод снегу, ляжыць постаць.
Якуб адразу спазнаў хлопца Яна,

Які раней хадзіў у касцёл,
А потым ягонае сэрца астыла да Бога.
Хлопец глянуў у вочы Якуба.
«Божа, ратуй!» — мовіць святар.
Якуб падае на калені, падбірае Яна.
Святар адчувае,
Як гэты слабы чалавек горнецца да яго,
Як нямоглы вандроўца грэецца
Ля агеньчыка,
На чужыне згубіўшыся.
Якуб узнімае Яна на плечы,
Нясе яго так асцярожна,
Як калісьці насіў
Авечак з цялятамі,
Калі ў вёсцы жыў.
Сіла нясе Якуба над снегам,
Святар хутка дайшоў
Да крайняй хаціны
Тутэйшае вёскі. Калі гаспадар
З гаспадыняй перанялі
Змерзлага Яна,
Якуб знясілена
Апусціўся на лаву,
Адкінуўшы галаву,
Заплюшчыўшы вочы.
«Божа, даруй мне,
Свайму цвёрдахрыбетнаму рабу,
Які не паверыў Твайму
Слову з першага разу».

Ян дацягнуўся рукой
Да далоні ксяндза —
Якуб спалохаўся дотыку.
Вочы Яна цяпер
Не мярцвенна-шкляныя —
У іх блішчыць жывое полымя:
«Дзякуй табе, войча».
«Уся слава Госпаду, —
Усміхаецца ксёндз, —
Ён мне сказаў,
Што ты там ляжыш».

***

У нядзелю Якуб
Прывёў пад руку Яна у касцёл.
Штурхнуў дзверы — зачынена.
«Апячатана», — паведаміў Ясь,
Які выйшаў з-за рога царквы.
Ён знерухомеў, убачыўшы Яна.
Ясь рад і не рад яго бачыць:
Колькі не біўся айцец Ясь
Над хлопцам Янам,
Каб той застаўся ў царкве —
Нічога не атрымалася.
А тут нейкі вясковы
Святарчык Якуб
Так лёгка прывёў Яна назад.
Ды яшчэ якога!
Вунь як вочкі ў Яна палаюць,
Зусім як у Якуба!

Ясю аж крыўдна,
Ён хоча таксама
Гарэць і не згараць…
Але для гэтага ж трэба
Ўсё жыццё Богу аддаць!
Усю чалавецкую славу скласці
У Хрыстовых ног і сказаць:
«Вось я, няшчасны
І жалю варты,
І ўбогі і сляпы і голы.
Але прадай мне золата,
Агнём ачышчанае,
Каб мне разбагацець,
І белую вопратку,
Каб апрануцца і каб не відзён
Быў сорам галізны маёй,
І масцю памазаць вочы мае,
Каб бачыць».
Бо каго Бог любіць,
Таго выкрывае і карае.
Але ў гэтым трэба прызнацца.

СУТАНА

Айцец Барыс
Папраўляе сівыя валасы —
Так ён заўсёды робіць,
Калі вядзе чуллівыя размовы.
Святар прыйшоў
У хату хворае ўдавы,
Якая мае пяцігадовую дачку
І сына-юнака.
Жанчына ціха плача праз
Жыццёвыя нягоды,
А ксёндз сухой рукой
Трымае ейную далонь.
Ківае. Моўчкі.
Гледзячы праз акуляры.
Бывае, мы імкнёмся
Даць параду чалавеку,
А дапамагчы сабе не можам.
Таму Барыс маўчыць:
Куды важней умець слухаць,
Чым прыгожа прамаўляць.
«Мой Сашка крадзе! —
Жанчына плача. —
Ён зблытаўся
Са злодзеям Сярожам!»
Айцец уздыхае:
«Сярожа — поўны сірата».
Да ксяндза бяжыць
Дзяўчынка Маша.

Ускоквае на святарскія калені:
Айцец Барыс ёй быццам бацька.
«Тату! Глядзі, якую цацку
Мне Сашка падарыў! —
І тыча ў рукі святара
Драўляны самалёцік. —
А Сашка будзе інжынерам!
Ён зробіць вунь такі самалёт,
А потым будзе лятаць.
Калі я вырасту,
Ён возьме і мяне!»
Слёзы напаўняюць
Святарскія вочы:
Дзіця назвала яго татам!

***

Тым часам Сашка цягне
Два вядры вады з калодзежу.
Мужчыны праходзяць міма
Глянуўшы на кволага падлетка,
Што ледзь перастаўляе ногі.
Яго сустрэў айцец Барыс.
«Вітаю! Вы ад нас?» —
Пытаецца хлапец.
«Дабрыдзень. Так, заходзіў, —
Ксёндз бярэ ў Сашы вёдры. —
Як справы? Як вучоба?»
Барыс адчуў,
Што зачапіў бальное.
«Хацеў бы паступіць на інжынера, —

Юнак хавае вочы, —
Куды мне там!»
«У цябе ўсё атрымаецца!
Ты — талент!»
Яны дайшлі да хаты Сашкі.
Далей ксёндз не пайшоў:
У акно ён бачыць,
Што кабета знайшла
Ў песенніку грошы,
Якія ёй Барыс пакінуў.
Кінецца вяртаць,
Калі айца ўбачыць.

***

Барыс ідзе ў касцёл,
Каля ўваходу затрымаўся:
Цімоха, малодшы брацік Сярожы,
Разам з хлопцам Васілём
Шкрабуць царкоўную скарбонку.
Бачаць: айцец Барыс!
Абодва здранцвелі.
Але святар нічога не сказаў:
Ён быццам не заўважыў.
Хлопцы робяць выгляд,
Што быццам не пры чым.
Уцякаюць.
Васіль краем вока ўбачыў,
Як святар Барыс
Адкрыў свой кашалёк
І пераклаў у скарбонку

Некалькі купюр:
Ён ведае,
Колькі грошай
Звычайна у скарбонцы.
Васілю сорамна:
Хай крадуць
Сярожа, Ціма, Саша —
Ім сапраўды патрэбны
Грошы на жыццё.
А ён чаму з імі?
Ён расце без бацькі, але маці —
Загадчыца ў калгасе
І заробак добры мае.

***

Хлопцы сустракаюцца ў лесе:
Саша і Сярожа
Даўно паплечнікаў чакаюць.
Сярожа — моцны хлопец,
Ён галоўны:
«Ну што, прынеслі?» —
Звярнуўся да браціка Цімохі.
«Канешне! —
Радуецца хлопчык. —
Вунь колькі грошай!»
«Цікава толькі, дзе іх скралі», —
Кажа Саша.
«У касцёле», —
Прызнаецца Васіль.
Твары Сашы і Сярожы

Памяняліся.
«Колькі я казаў, —
Рычыць Сярожа на Цімоху, —
У ксяндза не красць!
Ён і без таго нам дужа дапамог!»
Сярожа выхапіў мяшок
З рук Васі.
Адзін шыбуе да ксяндза.

***

Тым часам айцец Барыс ужо дома.
Айцец Павел,
Ягоны малодшы сябар,
Сядзіць на кухні з кнігай.
Барыс глядзіць
На маладога чалавека і думае:
Паўлушу трэба будзе
Справіць боты.
Хлопец адрываецца ад кнігі,
Вітаецца.
«Што сёння на абед?» —
Барыс за стол сядае.
«Нічога, — адказвае Павел. —
Я чакаў,
Калі ты прынясеш
Нашую зарплату,
І я змагу схадзіць у краму».
Шэрыя вочы старога ксяндза
Глядзяць у падлогу.
Паўлуша ўздыхае:

З дванаццаці гадоў
Ён сябруе з Барысам.
Прыйдзеш да яго, а ён заўсёды
З падарункамі-пачастункамі.
Цяпер Паўлуша разумее,
Што гасцінцы
З паветра не бяруцца.
«Прабач мне, —
Кажа рахманы Барыс. —
Ты і так худзенькі быў,
Са мной схуднеў шчэ больш».
Не паспеў Павел
Нічога адказаць,
Як у незачыненыя дзверы
Хаты ўваходзіць настаяцель.
Ксяндзы спуджаліся.
«Мір вам, — кажа настаяцель. —
Мне трэба рашыць з вамі пытанне.
Слухай, Барысе, гэта праўда,
Што са старой удавой
Адносіны маеш?»
Агаломшаны Барыс
Уткнуўся вачыма ў настаяцеля:
«Хто?..Я?..»
«Хто?! Ён?!» —
З-за спіны настаяцеля
Выгукнуў Сярожа.
Ён грошы Барысу прынёс.
Сярожа схапіў настаяцеля

За каўнер і цягне з хаты.
Ксяндзы спахапіліся яго ратаваць.
«Гэта настаяцель!» —
Крычыць Сярожу айцец Павел.
«Ды хоць Папа Рымскі! —
Цісне дужэй волат-Сярожа. —
А крыўдзіць айца Барыса
Я не дазволю!»
І выцягнуў настаяцеля са двара.
Павярнуўся да Барыса:
«Дужа пабіць
Ці проста павучыць?»
Ксяндзы ўчапіліся
Ў ягоныя рукі —
Просяць пра літасць.
«Эх вы, святошы, —
Зусім па-даросламу
Прамаўляе Сярожа. —
На святошах ваду возяць».
Настаяцель пабег да машыны.
Айцец Барыс цяжка ўздыхае:
«На жаль, нам няма чым
Пачаставаць цябе».
«Мне нічога не патрэбна.
Вось вашыя царкоўныя грошы».
Паўлуша галоднымі вачыма
Глядзіць на купюры.
«Не, пакінь, — кажа Барыс. —
Табе з Цімам патрэбней».

Вочы айца Паўла
Згаслі без аніякай надзеі.
Барыс гэта заўважыў.
«І ўсё роўна мы не возьмем!» —
Пратэстуе Сярожа.
«Добра, вазьму назад, —
Згаджаецца Барыс. —
Пры ўмове, што ты з братам
Пераначуеш у нас».
«Так і быць:
Але мне святарскіх падачак не трэба!»
Сярожа і Ціма пераначавалі
Ў гэтую ноч.
Айцец Барыс
Угаварыў іх застацца і ў наступную.
І ў трэцюю.
Урэшце рэшт неяк
Так атрымалася,
Што хлопцы ў іх зусім пасяліся.

ЗМЕСТ

Прадмова 3

***КНІГА 1* ФАГЕЛІЯНА 5**

Песня 1 Арышт біскупа 7
Песня 2 Пра працу пастара 11
Песня 3 Скрыпка біскупа Шэфэра 19
Песня 4 Гняздо фон Фогеляў 25
Песня 5 Спевы ластавак над лугам 35
Песня 6 Забаўны спявак з прыемным голасам, які добра грае 39
Песня 7 Чаму Люціка не любяць 43
Песня 8 Апошняя песня фон Фогеля 51
Песня 9 Найбольшае расчараванне Магнуса 55
Песня 10 Вучні Хрыста 61
Песня 11 Допыт 65
Песня 12 Спакуса 71
Песня 13 Чайная размова 75
Песня 14 У Сіёнскай святліцы прыбранай 79
Песня 15 Новы мір 82

***КНІГА 2* ПАСТАРАЛЬ 85**

Песня 1 Пастар Кольман 86
Песня 2 Гісторыя пастара Кольмана 93
Песня 3 Шлях да Хрыста 97
Песня 4 Сябра для ксяндза 105

***КНІГА 3* ЧАС ЗЛАМАНАГА КРЫЖА 113**

Песня 1 Пані Канрадайн 115
Песня 2 Вучаніца Канрадайн 121
Песня 3 Пастар Фішэр 125
Песня 4 Праблема сям'і Фішэраў 131
Песня 5 Праблемы паглыбляюцца 133
Песня 6 Справа пераходзіцьна новы ўзровень 141
Песня 7 Адвакат Канрадайн 145
Песня 8 Зорка на Хрыстовых грудзях 153

ПЯСЧАНІК 156

СУТАНА 162